КУЛЬТУРА

штотыднёвая грамадска-палітычная газета | выдаецца з кастрычніка 1991 года | № 2 (1701) | 10 студзеня 2025 г.

Стэнды ў павільёне і на вуліцы, зона культурных мерапрыемстваў, разнастайныя лакацыі, фуд-корт — маштабная экспазіцыя “Мая Беларусь”, што разгарнулася ў Мінскім міжнародным выставачным цэнтры, займае больш за 30 тысяч квадратных метраў. Дасягненні нашай дзяржавы дэманструюць пляцоўкі “Мы — будучыня”, “Разумны горад”, “Прыгожая краіна”, “Навука і інтэлект”, “Клопат і здароўе”, “Спартыўная краіна”, “На варце”, “Атамная энергія”, “Сельская гаспадарка”. Асаблівы настрой стварае прастора культурных праектаў. Тут штодня ладзяцца яскравыя імпрэзы ад кожнага рэгіёна Беларусі.

Фота Уладзіміра ШЛАПАКА

Працяг тэмы – на стар. 4.

9 771994 478007 25002

Натхняючы на добрыя справы

На гэтым святочным тыдні адзначаюць заслугі людзей, якія зрабілі Беларусь больш багатай маральна. Кіраўнік дзяржавы ўручыў прэміі “За духоўнае адраджэнне”, спецпрэміі Прэзідэнта дзеячам культуры і мастацтва і прэмію “Беларускі спартыўны Алімп”.

— Калядныя дні ствараюць асаблівую атмасферу і натхняюць на добрыя справы. Гэтак было спрадвеку, — сказаў Аляксандр Лукашэнка, звяртаючыся да ўдзельнікаў урачыстасці, якія сабраліся ў Палацы Рэспублікі 8 студзеня. — Такім мы разумеем гэта светлае свята і сёння. У ім вытокі нашай цырымоніі ўшанаўвання ў першыя дні новага года лаўрэатаў прэміі “За духоўнае адраджэнне” і спецыяльных прэмій Прэзідэнта. А само мерапрыемства ўжо стала традыцыяй суверэннай Беларусі. І мы не ўяўляем гэтыя чароўныя дні без прыгожага ўрачыстага моманту — моманту заслужанай славы нашых дастойных людзей.

Па словах лідара, усе лаўрэаты — падзвіжнікі і творцы сапраўднага мастацтва, захавальнікі душы беларускага народа.

Гэта дзеячы культуры, якія захоўваюць і ўзбагачаюць нацыянальную скарбніцу, абуджаюць цікавасць да народных рамёстваў, выхоўваюць павагу да нашых традыцый.

Сярод узнагароджаных таксама свяшчэннаслужыцелі, дактары, сацыяльныя работнікі, спартсмены — людзі, якімі кіруюць самыя шчырыя пачуцці: вернасць свайму прызванню і любоў да роднай зямлі.

— Асабліва важна гэта цяпер, калі краіна рыхтуецца адзначыць свяшчэнную дату — 80-годдзе Вялікай Перамогі, — падкрэсліў Прэзідэнт. — Мы беражліва захоўваем памяць аб мінулым, упэўнена рухаемся наперад і смела глядзім у будучыню.

Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што поспех лаўрэатаў натхняе беларусаў на новыя справы, бо ў аснове іх дзейнасці — духоўнасць і маральнасць, жыватворны эліксір для культуры, трывалай сувязі пакаленняў і традыцый. Яны і аснова адзінства нацыі, якая ведае сваю гісторыю, шануе спадчыну і клапоціцца пра будучыню. Аснова таго, што вызначае характар народа.

— Духоўнасць і маральнасць — фундамент моцнай, незалежнай дзяржавы, — акцэнтаваў Прэзідэнт. Па яго словах, дзякуючы такім патрыётам, стваральнікам, наша родная Беларусь застаецца астраўком міру, спакою, чалавекалюбства і міласэрнасці.

— Як бы нехта ні імкнуўся нас сёння расхістаць, нічога не атрымаецца, — упэўнены лідар. — Мы зберажом сваю краіну. Яна ўжо належыць нашым дзецям і ўнукам. Таму мы павінны падумаць пра іх будучыню, і мы думаем. Мы ўсё зробім у будучай пяцігодцы, каб наша краіна назаўсёды забыла праблему захавання сваёй дзяржаўнасці.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў:

— Трэба зберагчы мір для Беларусі. І мы зробім гэта разам з вамі.

Прэзідэнт павіншаваў усіх з Нараджэннем Хрыстовым, пажадаў міру, дабрабыту і “ўсміхацца, весяліцца і радавацца”.

Падрабязнасці — на сайце president.gov.by

Рэспубліканская акцыя “Ад усёй душы” — сапраўдны сімвал клопату і павагі да старэйшых. Дабрачынны марафон праходзіць з 26 снежня па 15 студзеня.

Ад усёй душы

Праект праводзіцца па ініцыятыве Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі ўжо трэці раз. Мэта — у навагодні час стварыць святочны настрой для прадстаўнікоў старэйшага пакалення, атуліць іх клопатам і прыцягнуць да гэтай справы моладзь. Менавіта ідэя сувязі пакаленняў працінае ўсю акцыю, якая праходзіць у два этапы. Першы — падрыхтоўка да ўрачыстасцей: упрыгожванне дамоў пажылых людзей, выраб сувеніраў, навядзенне парадку. Другі — віншавальны. Сацыяльныя пансіянаты, установы аховы здароўя, аддзяленні дзённага знаходжання наведваюць кіраўнікі дзяржаўных органаў, дэпутацкага корпусу, прадстаўнікі грамадскіх арганізацый.

Не застаецца ўбаку і сфера культуры: 3 студзеня ў Вялікі тэатр Беларусі запрасілі больш за тысячу пажылых людзей. Цёплыя, душэўныя словы ім са сцэны сказаў міністр культуры Руслан Чарнецкі. Да віншаванняў далучылася міністр працы і сацыяльнай абароны Наталля Паўлючэнка.

Для паважаных гледачоў дзіцячая студыя тэатра зладзіла канцэрт “Калядная зорка”. Юныя таленты падарылі праграму, складзеную з навагодніх і калядных песень і гімнаў. Упрыгожаннем урачыстасцей сталі выступленні салістак оперы Дыяны Трыфанавай і Алены Золавай. Кранальным атрымалася віншаванне ветэранаў сцэны Вялікага тэатра ў камернай зале. Жадаючыя змаглі паглядзець і прадстаўленне ў фае — казку “Дзень нараджэння Снежнай каралевы”. Яскравай фінальнай кропкай свята стаў паказ чароўнага балета “Шчаўкунок” П.І. Чайкоўскага ў пастаноўцы В. Елізар’ева.

Пад увагай Першага

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка заўсёды надаваў увагу пытанню рэканструкцыі тэатраў. Многія з гэтых храмаў мастацтва за час свайго існавання не абнаўляліся і на стыку тысячагоддзяў знаходзіліся не ў лепшым стане.

Кульмінацыяй у справе іх мадэрнізацыі стала Праграма рэканструкцыі і тэхнічнага перааснашчэння дзяржаўных тэатраў Рэспублікі Беларусь на 2004—2010 гады. У дакумент уключылі 24 аб’екты, якім неабходна тэрміновая дапамога. Сярод іх аказаўся і Вялікі тэатр оперы і балета.

У 2006-м па даручэнні Прэзідэнта пачалася маштабная рэканструкцыя. Кіраўнік дзяржавы паставіў задачу не толькі аснасціць галоўны тэатр краіны найноўшымі тэхналагічнымі прыстасаваннямі для работы трупы і паказу спектакляў. Таксама патрабавалася вярнуць будынку першапачатковае аблічча. І больш таго — рэалізаваць ідэі Іосіфа Лангбарда, якія ў савецкіх рэаліях не былі здзейснены.

Дэкор на сценах і мазаіка падлогі аднаўляліся па арыгінальных эскізах архітэктара з выкарыстаннем дарагіх матэрыялаў: граніту і мармуру. Сцэну нахілілі ў бок гледачоў, глядзельныя рады прыўзнялі. Пашыраныя магчымасці для спецэфектаў на сцэне з’явіліся дзякуючы гідраўлічным шахтам глыбінёй 20 метраў. Прастору пад сцэнай спецыяльна паглыбілі, выняўшы больш за 1000 кубаметраў зямлі. Крыху пазней дасталі яшчэ 500. За кошт гэтага музыкантам зрабілі дадатковыя памяшканні побач з аркестравай ямай. Агулам плошча тэатра пасля рэканструкцыі павялічылася амаль на 9000 квадратных метраў, што дазволіла размясціць на яго тэрыторыі новыя цэхі і тэхнічныя службы.

Абноўлены Вялікі тэатр адкрываў асабіста Прэзідэнт. На цырымоніі Аляксандр Лукашэнка сказаў: “Калі мы суверэнныя і незалежныя, а не правінцыя іншай дзяржавы, то трэба ствараць сімвалы суверэнітэту і незалежнасці, аб’екты, якімі мы будзем ганарыцца”.

Пасля адкрыцця ля тэатра з’явілася бронзавая таблічка: “Будынак Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Рэспублікі Беларусь пабудаваны ў 1939 годзе па праекце архітэктара Лангбарда І.Г. і рэканструяваны ў адпаведнасці з даручэннем Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Лукашэнкі А.Р. у 2006—2009 гадах”. Першы паказ на абноўленай сцэне адбыўся 8 сакавіка 2009 года.

Марафон на Гродзеншчыне

Рэспубліканскую грамадска-культурную акцыю “Марафон адзінства” сёння сустракае Ліда. Гэта першы горад Гродзенскай вобласці, дзе разгортваецца маштабны праект.



Шэраг цікавых сустрэч з выбітнымі дзеячамі краіны запланаваны на 10 студзеня ў Лідзе. Так, майстар-клас у дзіцячай школе мастацтваў зладзяць артысты Вялікага тэатра. Сярод іх — члены брас-квінтэта A.M.A.D.I.S. Brass, вядучы майстар сцэны Міхаіл Канстанцінаў і загадчык трупы аркестра Дзмітрый Гарбачук. Далучыцца да патрыятычнай акцыі і дырэктар Інстытута дзяржаўнай службы Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь Леанід Мальцаў. Ён паўдзельнічае ў праекце “Маё жыццё. Мой шлях. Мой Прэзідэнт”, што пройдзе ў Палацы культуры.

Парадуюць лідчан і гасцей горада экспазіцыі “Подзвігі і лёсы партызан у дакументах” выдавецкага дома “Беларусь сёння”, “Беларусь Узлет”, “Зямля таленавітых людзей”, дзе прадставяць легендарны слуцкі пояс, вырабы ткацтва і ганчарства, разьбу па дрэве, вышыўку, саломапляценне, роспіс па шкле, тканіне і дрэве. Выстава “З любоўю і падзякай” прадэманструе ўнікальныя падарункі Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь ад працоўных калектываў, а “Вялікі тэатр Беларусі: Гісторыя. Ідэі. Здзяйсненні” — касцюмы, дакументальныя сведчанні з гісторыі ўстановы, фатаграфіі, афішы спектакляў. Інтэрактыўная пляцоўка “У будучыню — разам!” распавядзе пра праекты навучэнцаў Нацыянальнага дзіцячага тэхнапарку. Прыедзе і мабільная экспазіцыя Музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны — яшчэ адзін неад’емны элемент акцыі.

Традыцыйна чакаецца квэст “Гэта ўсё маё роднае” і “Знакавая сустрэча” па тэме “Давярай, але правяры”: крытэрыі даверу ў сучасным свеце”. Спікеры — генеральны дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Вадзім Гігін, генеральны дырэктар БелТА Ірына Акуловіч і генеральны дырэктар агенцтва “Мінск-Навіны” Андрэй Крывашэеў.

Фінальным акордам двухдзённай праграмы стане маштабны канцэрт “Час выбраў нас”. Цудоўная сцэнаграфія, яркія творчыя нумары прафесійных і аматарскіх калектываў, зорак айчыннай эстрады — свята ў Лідзе завершыцца гучна.

Наступны прыпынак у маршруце — Гродна, які сустрэне марафон 17 студзеня.

Нагадаем, старт рэспубліканскай грамадска-культурнай акцыі 17 верасня даў Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка. З таго часу “Марафон адзінства” ахапіў Мінскую, Гомельскую, Брэсцкую, Віцебскую і Магілёўскую вобласці, а цяпер у спісе і Гродзенская.

Па старонках календара

■ **10 студзеня** нарадзіўся Васіль Васільевіч Галубовіч (1910—1991) — тэатральны мастак. Заслужаны дзеяч мастацтваў БССР. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР. Працаваў галоўным мастаком Беларускага тэатра імя Янкі Купалы, галоўным мастаком Рускага драматычнага тэатра БССР, выкладчыкам Беларускага тэатральна-мастацкага інстытута (цяпер Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў).

■ **12 студзеня** з’явіўся на свет Уладзімір Георгіевіч Мулявін (1941—2003) — спявак, кампазітар. Народны артыст БССР. Народны артыст СССР. Уладальнік медаля і ордэна Францыска Скарыны. Заснавальнік і мастацкі кіраўнік вакальна-інструментальнага ансамбля “Песняры”.

■ **13 студзеня** нарадзіўся Аляксандр Міхайлавіч Файнцымер (1906—1982) — кінарэжысёр. Заслужаны дзеяч мастацтваў БССР. Лаўрэат дзвюх Сталінскіх прэмій трэцяй ступені (адна з іх за фільм “Канстанцін Заслонаў”, зняты на кінастудыі “Беларусьфільм” сумесна з Уладзімірам Корш-Саблінным).

■ **14 студзеня** з’явіўся на свет Васіль Пятровіч Шаранговіч (1939—2021) — графік, педагог. Заслужаны дзеяч мастацтваў БССР. Народны мастак Беларусі. Уладальнік Дзяржаўнай прэміі БССР. Выкладаў у Беларускім тэатральна-мастацкім інстытуце (цяпер Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў). У 1989—1997-м быў рэктарам гэтай установы.

■ **15 студзеня** нарадзіўся Заір Ісакавіч Азгур (1908—1995) — скульптар. Заслужаны дзеяч мастацтваў БССР. Народны мастак БССР. Народны мастак СССР. Лаўрэат дзвюх Сталінскіх прэмій другой ступені. Герой Сацыялістычнай Працы. Сярод твораў партрэты герояў Вялікай Айчыннай вайны М. Сільніцкага, В. Талаша, М. Шмырова, К. Ракасоўскага, прадстаўнікоў айчыннай і сусветнай культуры Ф. Скарыны, Л. Александроўскай, Я. Купалы, Я. Коласа і інш. Аўтар барэльефа “Слава загінуўшым героям” для помніка-абеліска Перамогі ў Мінску.

■ **16 студзеня** з’явіся на свет Уладзімір Уладзіміравіч Алоўнікаў (1919—1996) — кампазітар. Заслужаны дзеяч мастацтваў БССР. Народны артыст БССР. Прафесар. Аўтар кантаты і араторыі, сімфанічных паэм, харавой і камерна-інструментальнай музыкі. Асабліва месца ў яго творчасці займаюць песні, якія прынеслі кампазітару шырокую вядомасць. Пачатковы матыў адной з іх — “Радзіма мая дарагая” — стаў пазыўнымі Беларускага радыё.

Ёсць чым ганарыцца!

Культурныя здабыткі і гістарычную спадчыну ўсіх рэгіёнаў можна ўбачыць на маштабнай выставе дасягненняў нашай краіны “Мая Беларусь”.

Майстры народнай творчасці Марыя Кіслухіна і Таццяна Волкава



Фрагменты экспазіцыі

Экспазіцыя пачала работу ў Мінскім міжнародным выставачным цэнтры напрыканцы снежня. Для дэманстрацыі культурных скарбаў выдзелена адна з самых вялікіх залаў.

— На гэтай пляцоўцы — далёка не ўсё, што ёсць у нашай сферы. Бо калі паказваць усё, то павільёна не хопіць. Але тут размешчаны самыя яскравыя дасягненні, — сказаў міністр культуры **Руслан Чарнецкі**, які наведаў выставу ў першы дзень яе працы.

І сапраўды, паглядзець ёсць на што. У кожнага з рэгіёнаў — асобны павільён. Акрамя разнастайных тэматычных экспанатаў — безліч інтэрактыўных праектаў. Працуе зона культурных мерапрыемстваў — канцэртная пляцоўка, на якой арганізавана насычаная відовішчная праграма.

— На працягу ўсіх сямі тыдняў на гэтай сцэне будуць праходзіць сустрэчы, прэзентацыі, паказы фільмаў, мультфільмаў і іншыя імпрэзы, — адзначыў Руслан Чарнецкі. — А ўвечары вобласці ладзяць канцэрт з удзелам сваіх талентаў. Для кожнага рэгіёна адведзены тыдзень.

Дарэчы, з поўнай праграмай мерапрыемстваў можна азнаёміцца на сайце *моябеларусь.бел*.

ЗАМКАВЫ КРАЙ

На пляцоўцы “Культурная спадчына” ўвагу найперш прыцягвае стэнд Гродзенскай вобласці. Шляхецкія касцюмы і рыцарская зброя, выявы старажытных замкаў пагружаюць наведвальнікаў у атмасферу далёкага і таямнічага Сярэдневечча.

— Найбольшай папулярнасцю ў гасцей карыстаюцца турнірныя даспехі з Мірскага замка, якія можна прымерыць, зрабіць у іх фота на памяць, — расказвае загадчыца навукова-асветніцкага аддзела Гродзенскага дзяржаўнага гісторыка-археалагічнага музея **Марыя Усманава**. — Мы дэманструем не толькі аб’екты гістарычнай спадчыны, але і расказваем пра сучасную культуру нашага краю. Сярод экспанатаў — сувенірная прадукцыя Рэспубліканскага фестывалю нацыянальных культур, які праводзіцца ў абласным цэнтры кожныя два гады.

У павільёне можна ўбачыць разнастайныя хлебабулачныя вырабы, у тым ліку з леташняга каравай-фэсту “Бацькава булка” ў Свіслачы. Як прыклад — макеты гродзенскага Старога замка і Каложскай царквы, зробленыя з салёнага цеста.

— Шырока прадстаўлена і народная творчасць: саломапляценне, мастацтва выразання выцінанак і роспіс велікодных яек. Лічу, што музейшчыкам трэба прыцягваць увагу да традыцыйных заняткаў, якія без належнай увагі могуць беззваротна страціцца. Таму пры стварэнні экспазіцыі адзін з акцэнтаў мы зрабілі менавіта на дэманстрацыі нематэрыяльнай культурнай спадчыны, — падкрэслівае Марыя Усманава.

СТАЛІЧНАЕ БАГАЦЦЕ

Каштоўнасці сталіцы дэманструюцца ў самым цэнтры выставачнай залы. Уваход у павільён створаны ў выглядзе дзвюх веж архітэктурнага комплексу “Брама Мінска”.

— У аснове экспазіцыі — прадметы, якія адлюстроўваюць розныя перыяды гісторыі, — распавядае вядучы навуковы супрацоўнік Музея гісторыі горада Мінска **Васіль Сідаровіч**. — Наведвальнікі могуць убачыць макет уязной брамы Мінскага замчышча. Побач — фігуры жыхароў XIII стагоддзя ў адзенні, стылізаваным пад тую эпоху. Таксама прадстаўлены манеты часоў Вялікага Княства Літоўскага і Расійскай імперыі, нідэрландскія і нямецкія грошы, знойдзеныя падчас раскопак у цэнтры Мінска.

Акрамя гэтага, у павільёне можна ўбачыць макеты Нацыянальнага мастацкага музея, Купалаўскага тэатра і музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Ёсць і паменшаная копія храма Усіх Святых, якая была перададзена на выставу Беларускай праваслаўнай царквой.

— Украінамі ў гістарычную канву мы размясцілі некалькі аб’ектаў выяўленчага мастацтва. Сярод іх — трыццаць вядомых мастачак па тэкстылі Любові Кірылавай і Веры Блінцовай. Работа адлюстроўвае сюжэты, традыцыйныя для беларускай культуры, і, бясспрэчна, заслугоўвае ўвагі наведвальнікаў, — адзначае Васіль Сідаровіч.

РАДЗІМА ФЕСТЫВАЛЯЎ

Шмат гасцей сабралася на пляцоўцы Віцебскай вобласці. Тут месца знайшлося і для невялікай сцэны, зробленай у выглядзе знакамітага Летняга амфітэатра, і для своеасаблівай карцінай галерэі.

— Наш край славіцца фестывалямі, вядомымі далёка за межамі краіны, — кажа навуковы супрацоўнік Віцебскага абласнога краязнаўчага музея **Варвара Сцельмашук**. — Таму нельга было пакінуць без увагі галоўны беларускі фэст — “Славянскі базар у Віцебску”. У нашым павільёне любы ахвочы можа паўдзельнічаць у праекце “Караоке з зоркай”: выканаць адну з песень, якія ў розныя гады гучалі са сцэны Летняга амфітэатра, і атрымаць сертыфікат, падпісаны дырэктарам фестывалю Глебам Лапіцкім.

Асобнае месца займаюць экспанаты, прысвечаныя тэатральнаму мастацтву. Сярод іх — касцюмы да спектакля “Несцерка”, які ідзе ў драматычным тэатры імя Якуба Коласа ўжо больш за 80 гадоў, а таксама батлейка — тэатр лялек, што сімвалізуе світанак беларускага тэатральнага жыцця.

— Калісьці на нашых землях перасякаліся найважнейшыя гандлёвыя шляхі Сярэдневечча. Як напамін пра гэта — муляж старадаўняга судна, дзе можна сфатаграфавацца. Таксама наведвальнікі выставы могуць азнаёміцца з інфармацыйнымі стэндамі аб розных перыядах гісторыі Віцебска і Полацка — адных з самых старажытных гарадоў Беларусі, — падкрэслівае Варвара Сцельмашук.

Якія скарбы дэманструюць іншыя рэгіёны і чым здзіўляюць наведвальнікаў? Убачыць усё на свае вочы лёгка: выстава “Мая Беларусь” працуе па 16 лютага ў новым комплексе “БелЭкспа” па адрасе вул. Паўліны Мядзёлкі, 24. Уваход вольны.

Даніл Піўкарэц
Фота Уладзіміра ШЛАПАКА

Люстэрка народнай душы

Урачыстае мерапрыемства Нацыянальнай камісіі па справах ЮНЕСКА, прымеркаванае да ўключэння беларускай выцінанкі ў Рэпрэзентатыўны спіс нематэрыяльнай культурнай спадчыны чалавецтва, адбылося ў Мастацкім музеі напрыканцы года.

Лізавета Чырвонцава, Наталля Кулецкая, Юлія Каўрус

Як адзначыў у вітальным слове міністр культуры **Руслан Чарнецкі**, у перспектыве ў нашай краіне можа з’явіцца музей выцінанкі. Работа над фарміраваннем беларускага сегмента ў Спісе сусветнай нематэрыяльнай культурнай спадчыны вядзецца пастаянна. Па словах Руслана Іосіфавіча, нашы творчыя дасягненні і далей будуць падавацца на ўключэнне ў гэты дакумент: усе мусяць ведаць, наколькі беларусы таленавітыя. Міністр падкрэсліў, што культура не мае меж, таму спробы закрыць айчынную культуру ад свету правальваюцца. Мы не павінны страчваць сяброўскія стваральныя кантакты паміж краінамі незалежна ад палітычных пытанняў.

МАСТАЦТВА З ГЛЫБІНІ СТАГОДДЗЯЎ

Міністр замежных спраў **Максім Рыжанкоў** заявіў: часта складана дэманстраваць міжнародны супольнасці беларускія аб’екты матэрыяльнай спадчыны, якія б маглі быць уключаны ў спіс ЮНЕСКА, бо шмат што аказалася страчана ў часы войнаў на тэрыторыі нашай краіны.

Разам з тым нематэрыяльную спадчыну, якая адлюстроўвае душу народа, мы здолелі захаваць.

Максім Уладзіміравіч таксама падкрэсліў, што выцінанка асацыіруецца з дзяцінствам, калі многія выразалі з паперы немудрагелістыя фігуры. Міністр замежных спраў падзяліўся, што выцінанцы яго вучыла ў вёсцы бабуля, а бабулю — яе бабуля. Гэтае мастацтва з глыбіні стагоддзяў нясе генетычны код Беларусі і сапраўды перадаецца з пакаленне ў пакаленне. Максім Рыжанкоў падзякаваў прадстаўнікам дыпламатычнага корпуса, якія далучыліся да мерапрыемства і выказалі падтрымку нашай культуры. Міністр таксама звярнуў увагу, што плённае супрацоўніцтва Беларусі з ЮНЕСКА працягваецца ўжо 70 гадоў.

У рамках цырымоніі майстры Юлія Каўрус з Гомельшчыны, Наталля Кулецкая з Брэстчыны і Лізавета Чырвонцава з Міншчыны атрымалі сертыфікаты аб уключэнні беларускага элемента “Выцінанка — традыцыйнае мастацтва выразання з паперы” ў Рэпрэзентатыўны спіс нематэрыяльнай культурнай спадчыны чалавецтва.

Удзельнікі ўрачыстасці таксама ўбачылі калекцыю адзення “Вырай”, створаную дызайнерам Кацярынай Герасіменка па матывах выцінанак Лізаветы Чырвонцавай. Адначасова ў Нацыянальным мастацкім адкрылася выстава “Беларуская выцінанка”, якую падрыхтавала Міністэрства культуры пры садзейнічанні музея і абласных выканаўчых камітэтаў.

НЕАД’ЕМНАЯ ЧАСТКА СПАДЧЫНЫ

Выцінанка — традыцыйнае мастацтва выразання з паперы, распаўсюджанае ў нашай краіне, якое зарадзілася яшчэ ў XVI стагоддзі і сёння набывае папулярнасць. Вытанчаная і шырока прызнаная ў якасці элемента беларускай культуры, выцінанка актыўна выкарыстоўваецца ў вонкавым і ўнутраным афармленні прыватных дамоў і грамадскіх месцаў, з’яўляецца неад’емнай часткай аўтэнтычных свят. Нашы бабулі, упрыгожваючы жыллё, бралі нажніцы, паперу (часам і газеты), складалі яе і выразалі ўзоры. Іх атрымлівалася столькі, колькі было зроблена складанняў.

За апошнія 30 гадоў гэтае мастацтва ў нас вельмі развілося, беларусам перадаюць яго ў дзіцячых садах, школах, нават у вышэйшых навучальных установах. І сёння ў тэхніцы выцінанкі ствараюцца самадастатковыя станковыя кампазіцыі са складанымі сюжэтамі, крыніцамі натхнення для якіх служаць фальклор, міфалогія, гісторыя, архітэктура. Цяпер гэта адзін з найбольш папулярных відаў творчасці.

АСНОВА НАЦЫЯНАЛЬНАЙ КУЛЬТУРЫ

Сучасная выцінанка становіцца ўсё больш крэатыўнай, а яе ўзоры пераносяцца на тканіну і выкарыстоўваюцца як элементы адзення. Выцінанка ахоплівае мноства тэм, якія адлюстроўваюць беларускі лад жыцця: мінуўшчына, прырода, звычаі і вераванні, сельскі і гарадскі побыт. Гэта адна з эстэтычных асноў нашага менталітэту і культуры. Уняесенне такога рамяства ў Рэпрэзентатыўны спіс — вынік суменнай работы майстроў, экспертаў і спецыялістаў па ахове нематэрыяльнай культурнай спадчыны, Нацыянальнай камісіі па справах ЮНЕСКА, Міністэрства культуры, Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, Міністэрства замежных спраў і Пастаяннага прадстаўніцтва Беларусі пры ЮНЕСКА.

Рашэнне аб уключэнні элемента “Выцінанка — традыцыйнае мастацтва выразання з паперы ў Беларусі” ў Рэпрэзентатыўны спіс нематэрыяльнай культурнай спадчыны чалавецтва было прынята Міжурадавым камітэтам па ахове нематэрыяльнай культурнай спадчыны ЮНЕСКА падчас 19-й сесіі 4 снежня 2024 года.

Падчас цырымоніі

Раней у гэты пералік дадалі святочны абрад “Калядныя цары” ў Семежаве Капыльскага раёна (2009), урачыстасці ў гонар ушанавання абраза Маці Божай Будслаўскай (Будслаўскі фэст) у Мядзельскім раёне (2018), абрад “Юраўскі карагод” у Пагосце Жыткавіцкага раёна (2019), культуру бортніцтва (2020) і мастацтва саломапляцення (2022).

Антон РУДАК
Фота Уладзіміра ШЛАПАКА

Асновы агульнай культурнай прасторы

Выставу “Расія — Беларусь. Скрыжаванне лёсаў” прадставілі ў Нацыянальным мастацкім музеі.

Гэта сумесны з Дзяржаўным Рускім музеем праект, у аснове якога — ідэя гістарычнай культурнай супольнасці дзвюх сучасных суверэнных дзяржаў, Расіі і Беларусі, унікальнасці і адзінства, аўтэнтычнасці і ўзаемаўплываў у прасторы культуры.



Выставу прэзентавалі 14 верасня ў Мармуровым палацы Дзяржаўнага Рускага музея ў рамках юбілейнага X Міжнароднага Санкт-Пецярбургскага форуму аб’яднаных культур. Экспазіцыя налічвае каля 300 жывапісных, графічных, скульптурных і дэкаратыўна-прыкладных твораў з багатых збораў двух вядучых мастацкіх музеяў Расіі і Беларусі. Куратарам выступіла генеральны дырэктар Нацыянальнага мастацкага Ганна Конанава.

МАШТАБНАЯ ЗАДУМА

Як адзначыў падчас адкрыцця выставы міністр **Руслан Чарнецкі**, гэты праект закладвае пачатак сур’ёзных узаемаадносін і развіцця нашай агульнай культуры. На 2025-ы музеямі, тэатрамі, канцэртнымі арганізацыямі і кінастудыямі дзвюх дзяржаў запланавана шмат цікавых супольных мерапрыемстваў. Руслан Іосіфавіч таксама нагадаў, што летась Нацыянальны мастацкі адсвяткаваў 85-годдзе. Ужо доўгі час гэтая ўстанова — арганізатар і ўдзельнік вялікай колькасці міжнародных выставачных і навуковых мерапрыемстваў.

Паводле слоў **Ганны Конанавай**, экспазіцыя была задумана крыху менш за год таму. Супрацоўнікі музея імкнуліся здзейсніць ідэю мениавіта ў падобны сціслы тэрмін, бо яна ляжала на паверхні, але ў такім маштабе і на такім узроўні рэалізоўвалася ўпершыню.

АДШУКАЦЬ КАРАНІ

У чатырох залах новага выставачнага корпуса прадстаўлены работы больш як паўсотні творцаў. Яны нарадзіліся на гістарычных беларускіх землях і атрымалі прафесійную адукацыю ў асноўных расійскіх мастацкіх навучальных установах, у тым ліку ў Імператарскай Акадэміі мастацтваў у Санкт-Пецярбургу і Маскоўскім вучылішчы жывапісу, скульптуры і дойлідства. Ганна Конанава распавяла, што гэта аўтары з сусветным значэннем: прадстаўнікі дынастый Хруцкіх, Гараўскіх, Сяргей Заранка, які быў прафесарам згаданага вучылішча і акадэмікам Імператарскай Акадэміі мастацтваў. Нельга забыць і пра Вітольда Бялыніцкага-Бірулю, майстра лірычнага пейзажа, знакамітага вучня Левітана і Паленава, а таксама пра беларускага вучня Ільі Рэпіна — Льва Альпяровіча. Многія народныя мастакі нашай краіны таксама скончылі расійскія ўстановы: Яўген Зайцаў, Натан Воранаў, Павел Масленікаў, Май Данцыг, Міхаіл Савіцкі, Віталь Цвірка.

Дырэктар Дзяржаўнага Рускага музея **Ала Манілава** падкрэсліла, што праект падрыхтаваны ў рэкордныя тэрміны. Ён адметны маштабам супрацоўніцтва двух музеяў. Была задача навуковымі сіламі куратараў, мастацтвазнаўцаў, гісторыкаў выяўленчага мастацтва прааналізаваць нашы карані, знайсці пункт зборкі агульнай культурнай прасторы. У працэсе даследавання, распавядае Ала Манілава, стала зразумела: яны тоящца ў тым перыядзе XIX стагоддзя, калі народжаныя на спрадвечных беларускіх землях таленты шукалі месцы прыцягнення ў Расійскай імперыі, калі на беларускіх землях яшчэ не ўзніклі мастацкія школы (яны пачалі з’яўляцца напрыканцы XIX і на заранку XX стагоддзя). Такім чынам у беларускіх і рускіх аўтараў фарміравалася падобнае мастацкае бачанне.

ХРЭСТАМАТЫЙНЫЯ ПАЛОТНЫ

Сітуацыя змянілася ў XX стагоддзі, калі традыцыяй стала, авалодаўшы прафесіяй, вяртацца ў родныя мясціны. Мастацкія школы ствараліся ў Віцебску, Гомелі, Гродне, Мінску і Полацку. У 1910—1920-я Віцебск зрабіўся культурным цэнтрам сусветнага значэння, дзе жылі і працавалі вялікія авангардысты Казімір Малевіч, Марк Шагал і Эль Лісіцкі. У 1945-м была заснавана Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў. Аднак нашы майстры не страцілі цікаўнасць да рускага мастацтва. Многія з іх жылі, вучыліся і выстаўляліся ў Расіі, пры гэтым не забываючыся на карані.

У экспазіцыі прадстаўлены такія знакамітыя работы Івана Хруцкага, як “Нацюрморт з кветкамі і садавіной” са збору Дзяржаўнага Рускага музея і “Партрэт невядомай з кветкамі і садавіной” з Нацыянальнага мастацкага. Таксама можна ўбачыць палотны “Дзмітрый Данской на Куліковым полі” і “Мікалай Цудатворац. Выява з малога іканастаса Казанскага сабора ў Пецярбургу” Васіля Сазонава, “Уладзімір і Рагнеда” Антона Ласенкі з калекцыі Рускага музея, “Канюшына цвіце” Апалінарыя Гараўскага і многія іншыя.

Азнаёміцца з выставай можна да 31 сакавіка.

Антон РУДАК
Фота Уладзіміра ШЛАПАКА

На здымках:
1—3. Падчас адкрыцця выставы.
4. Ала Манілава.
5. Ганна Конанава.

Баль на стары Новы год пройдзе 13 студзеня ў Вялікім тэатры Беларусі.

Доўгі шлях да Перамогі

Выстава “Дарога да міру”, даступная ў Дзяржаўным музеі гісторыі беларускай літаратуры, падрыхтавана ў межах міжнароднага супрацоўніцтва з Дзяржаўным музеем гісторыі расійскай літаратуры імя У. І. Даля. Праект, прымеркаваны да 80-годдзя вызвалення Беларусі ад нацысцкіх захопнікаў і 80-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне, увосень ужо распачаў сімвалічнае падарожжа па мясцінах памяці: перадусім ён быў прадстаўлены ў мемарыяльным комплексе “Брэсцкая крэпасць-герой”.

Наменнік дырэктара па экспазіцыйна-выставачнай дзейнасці Дзяржаўнага музея гісторыі расійскай літаратуры імя У. І. Даля **Наталля Папаніна** падкрэсліла: мастацкія аб’екты, прэзентаваныя ў рамках “Дарогі да міру”, створаны супрацоўнікамі ўстановы паводле ўласнай задумы. Гэта аб’ёмна-прасторавыя ілюстрацыі да работ пісьменнікаў, якія былі сведкамі ваеннага ліхалецця. А інтэрактыўныя інсталяцыі, дзе можна пабачыць цытаты, заахвочваюць гледача да далейшага знаёмства са здабыткамі майстроў слова.

СВЕДКІ І ЎДЗЕЛЬНІКІ

Наталля Адамовіч, супрацоўнік Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Я. Коласа, дачка аднаго з герояў выставы — Алеся Адамовіча, падзялілася гісторыяй стварэння яго “Блакаднай кнігі” (суаўтар — савецкі і расійскі пісьменнік Даніл Гранін). Адметна, што штуршок далі аповеды дачкі Максіма Гарэцкага, Галіны, якая на пачатку Вялікай Айчыннай была студэнткай у Ленінградзе і пераказала Алесю Адамовічу багата жахаў блакады. Таксама Наталля Адамовіч паведаміла, што ў лістападзе прэзентавалі першы пераклад на нямецкую мову не менш знакамітай і важнай для асэнсавання ваеннай трагедыі кнігі “Я з вогненнай вёскі”. Інтэрв’ю ў сведак для яе бралі Алесь Адамовіч, Уладзімір Калеснік і Янка Брыль.



Асобы праекта — майстры слова, якія прайшлі дарогамі Вялікай Айчыннай і пакінулі бясцэнную літаратурную спадчыну: Алесь Адамовіч, Булат Акуджава, Віктар Астаф’еў, Васіль Быкаў, Даніл Гранін, Міхаіл Зошчанка, Веніямін Каверын, Віктар Някрасаў, Андрэй Платонаў, Канстанцін Сіманаў ды іншыя. Іх творы вылучаюцца шчырасцю эмоцый і праўдзівасцю. Гэта гісторыі аб выжыванні і мужнасці, маральным выбары і гонары, сяброўстве і здрадзе, гераістве і дэзерцірстве. Усе з’яўляюцца помнікамі культуры ды літаратуры, кранаюць і пакаленне, якое пераадолела ліхалецце, і дзяцей вайны, і тых, хто ведае пра яе толькі па аповедах продкаў.

ДЗЕВЯЦЬ СТАРОНАК ПАМЯЦІ

1941—1945 гады пакінулі незагойныя раны, боль ад якіх перадаецца праз пакаленні і нават сёння застаецца ў сэрцах нашчадкаў. Перажытыя, пераасэнсаваныя і выкладзеныя на паперы літаратарамі-франтавікамі падзеі натхнілі мастачак Наталлю Раманаву і Кацярыну Ірхіну з Дзяржаўнага музея гісторыі расійскай літаратуры на распрацоўку аўтарскіх інсталяцый. Выстава ўяўляе сабой своеасаблівую мазаіку з апісанняў, успамінаў і дзённікавых нататак, архіўных фотаздымкаў і дакументаў. Дзевяць інсталяцый — прасторавых вобразаў, дапоўненых фрагментамі твораў і фактамі з біяграфій, — прапануюць новы погляд на старонкі літаратуры і мінуўшчыны.

Інсталяцыя, якой адкрываецца экспазіцыя, знаёміць са спадчынай Веніяміна Каверына. У яго творах адлюстраваны ваенныя будні Паўночнага флоту. Тэма Вялікай Айчыннай закранаецца ў зборніках “Мы сталі іншымі”, “Школа мужнасці” і, безумоўна, у найбольш знакамітым рамане аўтара “Два капітаны”. Чарговы раздзел распавядае пра Канстанціна Сіманава, які праілюстраваў гераічную абарону Магілёва ўлетку 1941 года ў вядомым рамане “Жывыя і мёртвыя”. Яшчэ ў адной інсталяцыі надаецца ўвага бітве за Сталінград, якую апісвалі Васіль Гросман, Віктар Някрасаў, Міхаіл Шолахаў, Ілья Эрэнбург і многія іншыя. Асобныя часткі праекта расказваюць аб творах, прысвечаных штодзённасці ў тыле, партызанам, выжыванню пад акупацыяй. Сімвалічна замыкае экспазіцыю інсталяцыя ў выглядзе ганка Рэйхстага, на калонах якога можна прачытаць радкі з песень паэта-франтавіка Булата Акуджавы.

Выстава будзе працаваць да 11 мая.

Антон РУДАК
Фота аўтара

Гастролі пермскага тэатра “Ля моста” адбудуцца 18 і 19 лютага ў Магілёве.

Вяртанне шматвяковай славы

Турыстычны аўтобус спыняецца ля невялікага прыгожага возера. Над ім узвышаецца замак-волат. Сказаць, што ён уражвае, — недастаткова. Колькі падзей за пяць стагоддзяў бачылі сцены цвярдыні! Кожная расколіна, кожны камень захоўваюць таямніцы, якія чакаюць, каб пра іх расказалі.



1. Мірскі замак у нашы дні.
2. На тэрыторыі комплекса.
3. Стан у 1974 годзе.
4. Загадчык аддзела па экскурсійнай рабоце музея Алена Сенкевіч.

АДРОДЖАНЫ СКАРБ

Мірскі замак не проста архітэктурны цуд. Гэта нацыянальны здабытак Беларусі, наш брэнд. Ён прыцягвае сотні тысяч турыстаў з усяго свету, якія хочуць дакрануцца да гісторыі. Тут можна, гуляючы па залах, адчуць дух Сярэднявечча, успомніць шматлікія легенды ў падзямеллях і атрымаць асалоду ад маляўнічых відаў з байніцы вежы, дзе вецер шэпча пра былое. Сёння замак — цэнтр культурных падзей — ахутвае наведвальнікаў унікальнай атмасферай: мінулае і сучаснасць пераплятаюцца, і гэта дорыць кожнаму незабыўныя ўражанні.

Міжволі прыгадваецца канец 1980-х. Пабітыя часам і людзьмі сцены, даху над палацавай часткай няма, абломкі цэглы, трава па пояс... Карціна была такая, што здавалася: мы страцілі архітэктурны скарб назаўжды. І якое шчасце бачыць яго адноўленым!

Аляксандр Лойка

ЦЯЖКІ ПАЧАТАК

Пра тое, як адраджаўся помнік дойлідства, распавялі дырэктар музея "Замкавы комплекс «Мір»" **Аляксандр Лойка** і вучоны сакратар установы **Ігар Ложачнік**.

— Рэстаўрацыйныя працы ў Мірскім замку пачаліся ў 1983-м. Тады ўся палацавая частка, як і вежы, уяўляла сабой перыметр са знешніх сцен без перакрыцця, — расказвае Аляксандр Лойка. — У 1987-м замкавы комплекс стаў філіялам Дзяржаўнага мастацкага музея (цяпер — Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь). У 1992-м адкрылася адрэстаўраваная паўднёва-заходняя вежа з першымі экспазіцыямі. У гэтым вялізная заслуга Юрыя Карачуна, які ў той час узначальваў Мастацкі музей. Аднак у канцы 1990-х і на пачатку нулявых рэстаўрацыя вялася вельмі марудна, не было пастаяннага і зразумелага фінансавання.

ПАСПЯХОВЫ ДОСВЕД

— Гэта быў першы ў летапісе незалежнай дзяржавы вопыт маштабнай музеефікацыі і рэстаўрацыі ўнікальнага гістарычнага аб'екта, — адзначае Ігар Ложачнік. — Велізарную нагрузку тады ўсклалі на сябе Нацыянальны мастацкі музей, Інстытут гісторыі Акадэміі навук Беларусі. Была створана і потым рэалізавана навуковая канцэпцыя па музеефікацыі 39 экспазіцыйных зал. Сапраўды каласальнае выпрабаванне для ўсіх, хто быў задзейнічаны ў прыстасаванні і музеефікацыі аб'екта, уключанага ў 2000-м у Спіс сусветнай прыродная і культурнай спадчыны! І, як паказалі гады, гэта паспяховы досвед.





Мірскі замак нярэдка становіцца пляцоўкай для кіназдымак

ВЫСОКІЯ ПАКАЗЧЫКІ

Сёння замкавы комплекс "Мір" — адзін з найбольш камерцыйна паспяховых музеяў у краіне. Самаакупнасць складае каля 80% — гэта практычна найвышэйшы паказчык (хаця выдаткі на ўтрыманне істотныя).

— Замкавы комплекс "Мір" — наглядны прыклад паспяховага інвеставання дзяржаўных сродкаў у гісторыка-культурную спадчыну, — падкрэслівае Аляксандр Лойка і дае лічбы для параўнання: — Калі ў 2001-м ва ўстанову завітала крыху больш за 50 тысяч чалавек, то за няпоўны 2024-ы тут прынялі больш за 400 тысяч турыстаў — самы высокі паказчык па наведвальнасці за ўвесь перыяд існавання музея.

Цяпер на тэрыторыі комплексу прадстаўлены Мірскі замак XVI—XX стагоддзяў, капліца-пахавальня князёў Святаполк-Мірскіх, домік вартаўніка, руіны палаца апошніх уладальнікаў, флігель, прыдарожная капліца, англійскі пейзажны парк з сажалкай, рэшткі італьянскага саду, земляныя валы з бастыёнамі. У цвярдыні, акрамя музейнай часткі, існуе апартаментная — рэстаран і атэль на 16 нумароў. Ёсць магчымасць праводзіць рэспубліканскія і міжнародныя пасяджэнні: працуюць вялікая і малая канферэнц-залы.

За пазабюджэтныя сродкі ў 2022-м быў зроблены капітальны рамонт дамбы. На ёй адкрылі летняе кафэ.

Элемент тэатралізаванай экскурсіі

Падчас рэканструкцыі, 2005

ПЛАНЫ ЁСЦЬ. ЗДЗЯЙСНЯЛЬНЫЯ!

— Паралельна з будаўніцтвам кафэ мы прыступілі да складання праектна-каштарыснай дакументацыі па аднаўленні італьянскага саду, — распавядае дырэктар музея. — Праца пачалася з даследаванняў, праведзеных сумесна з Нацыянальнай акадэміяй навук. Падчас падрыхтоўкі ўзаемадзейнічалі з саветам па культуры пры Міністэрстве культуры Рэспублікі Беларусь.

Адметна, што сад аднаўляецца там, дзе быў пры Радзівілах. Высаджваюцца дрэвы, робяцца клумбы і дарожкі. Каб стварыць асаблівую атмасферу, на возеры, добраўпарадкаванне якога стартавала, усталююць фантан. Работы фінансуюцца з пазабюджэтных сродкаў музея, але прыцягваюцца і дзяржаўныя інвестыцыі.

— Плануем рэканструкцыю другога моста, што дазволіць закальцаваць маршрут вакол возера, — расказвае Аляксандр Лойка. — Змены закрануць і хваёвую алею — упадабанае месца турыстаў і мясцовых жыхароў для прагулак.

ГІСТАРЫЧНАЕ РАШЭННЕ

— Усё змянілася 24 чэрвеня 2007 года, калі Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ўпершыню наведаў Мірскі замак. Менавіта тады Кіраўнік дзяржавы і прыняў гістарычнае рашэнне аб дадатковым фінансаванні і паскарэнні работ па рэстаўрацыі аб'екта гісторыка-культурнай спадчыны і прыстасаванні яго для турыстычных мэт. Гэта дазволіла завяршыць аднаўленне ў сціслым тэрміны — усяго за тры гады, — канстатуе Ігар Ложачнік, які асабіста ўдзельнічаў у сустрэчы з лідарам.

Замоўцам прац у 2007-м выступаў Нацыянальны мастацкі музей. На той момант ужо былі затрачаны дзясяткі мільярдаў недэнамінаваных рублёў. Для завяршэння рэстаўрацыі, якое планавалася ў 2010-м, сродкаў патрабавалася яшчэ больш. Дзякуючы ініцыраванай Прэзідэнтам і Урадам Беларусі інвестыцыйнай праграме першы пускавы комплекс па аднаўленні Мірскага замка пачаў фінансавацца належным чынам.

На сродкі рэспубліканскага бюджэту за тры гады праклалі неабходныя інжынерныя сеткі — ад водазабеспячэння да ахоўнай сігналізацыі, зрабілі чыставое аздабленне палацавых частак і веж замка пад экспазіцыі і гасцінічныя нумары з рэстаранам, закупілі музейнае абсталяванне і прадметы музейнага значэння, добраўпарадкавалі тэрыторыю вакол цвярдыні і капліцы-пахавальні. Генеральным падрадчыкам падчас рэстаўрацыйна-аднаўленчых работ стала прадпрыемства "Белрэстаўрацыя". Акрамя таго, па субпадрадных заказах за ўвесь перыяд прац задзейнічалі каля 120 спецыялізаваных арганізацый.

АДНАЎЛЕННЕ СУВЯЗІ

Мірскі замак урачыста расчыніў дзверы пасля маштабнай рэстаўрацыі 16 снежня 2010 года. У цырымоніі ўдзельнічаў Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка. Ён пакінуў запіс у кнізе ганаровых гасцей.

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што Беларусь па праве ганарыцца сваім багатым гістарычным і культурным мінулым. Сярод найвышэйшых дасягненняў майстэрства нашых суайчыннікаў — Мірскі замак, унікальны прыклад нацыянальнага дойлідства XVI—XX стагоддзяў. Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, не проста адбудоўваўся помнік архітэктуры — паступова, крок за крокам аднаўлялася перарваная сувязь часоў, вярталася шматвяковая слава і адраджаліся гістарычная самасвядомасць і вера ў тое, што беларусы — народ герояў і тытанаў духу.

БАГАТЫ АРСЕНАЛ

Замкавы комплекс "Мір" — асветніцкая і культурна-адукацыйная ўстанова, якая ажыццяўляе навукова-даследчую і выдавецкую дзейнасць. Асноўны фонд налічвае 3000 унікальных прадметаў. У скарбніцы самая вялікая сярод беларускіх музеяў калекцыя шпалер канца XVI — пачатку XX стагоддзя, шляхецкіх гузікаў XVII—XVIII стагоддзяў, вееравў XVIII—XX стагоддзяў. І экспазіцыі працягваюць дапаўняцца.

Гасцям прапануюць шэраг платных паслуг, спіс якіх пастаянна пашыраецца. На павелічэнне колькасці наведвальнікаў працуе цэлы спектр ініцыятыў. Асаблівая ўвага надаецца рэалізацыі выставачных праектаў, правядзенню канцэртаў і спектакляў, экскурсій з элементамі тэатралізацыі, квэстаў, тэматычных майстар-класаў, баляў і гістарычных рэканструкцый. Так, Дню народнага адзінства прысвяцілі экспазіцыю "Мір на фота: 100 гадоў ад веку мінулага да дня сённяшняга". Часовую выставу "Жыццё без меж" — сумесны праект музея і Мінскага гарадскога сацыяльнага пансіяната "Вяча" — прымеркавалі да Дня інвалідаў Рэспублікі Беларусь. Таксама ладзяцца калядныя балі.

— Акрамя тэматычных экскурсій, у нашым арсенале самыя розныя актуальныя формы работы з наведвальнікамі — ад квэстаў да музейна-камунікатыўных праграм, заснаваных на прадметах скарбніцы, — тлумачыць Аляксандр Лойка. — А яшчэ мы адзіныя ў краіне распрацавалі цырымонію сустрэчы ганаровых гасцей, падчас якой выкарыстоўваецца гармата.

Вольга Навіцкая, намеснік дырэктара па навуковай і асветніцкай рабоце музея "Замкавы комплекс «Мір»", з дыпломам XXII Рэспубліканскага турыстычнага конкурсу "Спазнай Беларусь", 2024

СТАТУС = АДКАЗНАСЦЬ

Сёлета Мірскі замак адсвяткуе 25-годдзе ўключэння ў Спіс сусветнай культурнай і прыродная спадчыны ЮНЕСКА.

— Высокі статус не толькі дае нашаму комплексу пэўную перавагу (пазнавальнасць і вядомасць за межамі Беларусі), але і патрабуе значнай адказнасці калектыву па захаванні ўнікальных рыс гісторыка-культурнай каштоўнасці. Гэта разумеюць усе 132 работнікі, кожны нацэлены на дасягненне найлепшых вынікаў, — гаворыць дырэктар. — У 2027-м споўніцца 500 гадоў з першай згадкі Мірскага замка ў архіўных дакументах, і мы ўжо запланавалі юбілейныя мерапрыемствы. Установа працуе 32 гады (да 2011-га — у якасці філіяла Нацыянальнага мастацкага) і рэалізоўвае ўсе віды музейнай дзейнасці, прадугледжаныя заканадаўствам. Удзяляем увагу выяўленню, вяртанню, сумеснаму выкарыстанню і ўвядзенню ў навуковы і культурны абарот каштоўнасцей, што знаходзяцца за межамі краіны. Напрыканцы 2024-га скарбніца стала дыпламантам XXII Рэспубліканскага турыстычнага конкурсу "Спазнай Беларусь" у намінацыі "Музей года" (паднамінацыя "Рэспубліканскія/абласныя (уключаючы мінскія гарадскія) музеі"). Наш комплекс задавальняе ўсе крытэрыі для прысваення статусу нацыянальнага. Яго наданне яшчэ больш павысіць прэстыж і будзе адпавядаць ролі, якую ўстанова іграе ў папулярызацыі культуры і гісторыі Беларусі.

Святлана ЧЭКАЛАВА

Бывайце, Бялынічы! Прывітанне, Іванава!

Ганаровае званне "Культурная сталіца — 2025" атрымаў горад Іванава. Эстафету яму напрыканцы 2024 года перадалі Бялынічы.

НАЎЗДАГОН

Урачыстую цырымонію правялі ў раённым Цэнтры культуры. Гасцей сустракала навагодняя інтэрактыўная пляцоўка з касцюміраванымі персанажамі і канцэртна-забаўляльнай праграмай. Тут жа прайшоў майстар-клас па выцінанцы, якую нядаўна прызналі элементам нематэрыяльнай культурнай спадчыны ЮНЕСКА. Магілёўскі абласны тэатр лялек прадставіў дзіцячы спектакль. Адбылася творчая сустрэча з Наталляй Навоенка, мастаком-пастаноўшчыкам новага фільма "Чорны замак" па рамане У. Караткевіча. Працавалі экспазіцыі "Крыніца каштоўнасцей — гістарычная памяць", "Стагоддзе беларускага кіно", а таксама выстава работ удзельнікаў міжнароднага пленэру "Вобраз Радзімы ў выяўленчым мастацтве".

Ганаровае званне "Культурная сталіца" Бялынічы годна неслі на працягу ўсяго 2024-га. У райцэнтры арганізавалі дзясяткі творчых праектаў, у тым ліку імпрэзы з вядомымі дзеячамі мастацтваў, выставы, акцыі і фестывалі, паказы прэм'ерных фільмаў і спектакляў, канцэрты.

— Для Бялынічаў мінулы год быў вельмі насычаным, — адзначыла старшыня райвыканкама **Вольга Прыстромская**. — Дзякуй за гэта нашым артыстам і творчым людзям. У іх была выдатная магчымасць паказаць, на што мы здольныя, расказаць пра сябе і сваю родную зямлю. Статус культурнай сталіцы ўплывае на развіццё не толькі канкрэтнага населенага пункта, але і ўсяго рэгіёна.

ШЧЫРА ЗАПРАШАЕМ

Па словах старшыні Іванаўскага раённага Савета дэпутатаў **Рыгора Сысы**, рашэнне ўдзельнічаць у барацьбе за званне "Культурная сталіца — 2025" не прымаецца спантанна. Для гэтага павінен быць рэсурс, які назапашваецца дзесяцігоддзямі.

— Культуру і традыцыі Іванаўскага раёна немагчыма паказаць нават за тры дні, — падкрэсліў Рыгор Сыса. — У нас 25 калектываў са званнямі народнага, узорнага, заслужанага. Кожны можа даць паўнавартасны канцэрт. На працягу 2025 года ўсім забяспечым магчымасць раскрыцца і прадставіць тое, чым яны валодаюць і што ўмеюць. Мы рады прымаць гасцей. Гэта будзе ўмацоўваць і ўзбагачаць наш патэнцыял.

Як адзначыў старшыня Іванаўскага раённага Савета дэпутатаў, духоўнасць і культура павінны ісці ад сэрца і перадавацца з пакалення ў пакаленне. У кожнай мясцовасці фарміруецца свой асаблівы культурны код. Іванаву таксама ёсць чым ганарыцца.

— Наша гордасць — спадчына роду Дастаеўскіх, вёска Дастоева. Хочаце даведацца, адкуль пайшло гэтае прозвішча, прыязджайце ў Іванаўскі раён. Тут багата матэрыялаў, якія раскрыюць гісторыю роду. Імя мастака Напалеона Орды вядомае ва ўсім свеце, а гэта ўраджэнец нашай вёскі Варацэвічы. Па яго карцінах аднаўляюцца многія гісторыка-культурныя каштоўнасці ў краіне. Адзіная ў Беларусі школа бондарства таксама працуе ў нас. Вось толькі малая частка нашых скарбаў, — запрашае ў госці Рыгор Сыса.

ШЫРОКАЕ ПАНЯЦЦЕ

Начальнік упраўлення культуры і народнай творчасці Міністэрства культуры **Ірына Карповіч** на ўрачыстай цырымоніі ў Бялынічах заявіла, што рэспубліканская акцыя "Культурная сталіца" дазваляе шырока прэзентаваць творчыя здабыткі, мінулае раёнаў.

— Кожны рэгіён мае глыбокую каранёвую сістэму ў традыцыях, культуры, мастацтве, гісторыі, — сказала Ірына Карповіч. — Каб гэта шырока прадэманстраваць гасцям і жыхарам нашай краіны, неабходны сапраўды вызначальны фактар. І такім фактарам стала рэспубліканская акцыя "Культурная сталіца". Рэгіён, якому пашчасціла заваяваць тытул, стараецца, каб пра яго даведаліся як мага больш: пра таленавітых людзей, гісторыю, традыцыі, асаблівасці. Разам з тым культура — шырокае паняцце. Таму да гэтага статусу падцягваюцца ўсе астатнія сферы, уключаючы жыллёва-камунальную і сельскую гаспадарку. Як вядома, толькі разам, усім светам, можна зрабіць сапраўды годныя справы.

ЯРКІ АКОРД

Намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама **Алег Сцельмашок** нагадаў, што ганаровае званне "Культурная сталіца" прысуджаецца беларускім населеным пунктам з 2010 года. У Бялынічах на працягу 2024-га прайшло больш за 150 розных праграм. Іх гледачамі сталі звыш 10 тысяч чалавек. Падчас мерапрыемстваў Магілёўшчына прэзентавала шэраг сваіх культурных брэндаў: Міжнародны маладзёжны тэатральны форум "М.@rt.кантакт", Міжнародны фестываль дзіцячай творчасці "Залатая пчолка", рэспубліканскае свята "Купалле" ("Александрыя збірае сяброў").

Цырымонію перадачы звання "Культурная сталіца" завяршыў вялікі канцэрт майстроў мастацтваў з Мінска, Магілёва, Бялынічаў, Іванава. Цікавая рэжысура і яркія выступленні юных выканаўцаў ды самадзейных калектываў з навучальных устаноў Магілёўскай вобласці зрабілі свята прыгожым і душэўным.

Віктар ГАЎРЫШ
Фота аўтара

Абласны фестываль-кірмаш "Берасцейскія сані" пройдзе з 10 па 12 студзеня ў Кобрыне.

Эдуард ПЕЛАГЕЙЧАНКА

Вядомы дзеяч беларускага опернага мастацтва, народны артыст РСФСР, адзін з найлепшых тэнараў 1980—1990-х, дацэнт Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі. Уладальнік медаля Францыска Скарыны, Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь і прэміі імя Л.П. Александроўскай.



1940

Эдуард Іванавіч Пелагейчанка нарадзіўся 2 студзеня 1940 года ў Варашылаўградзе Украінскай ССР (цяпер Луганск).

1964

Скончыў Алтайскі політэхнічны інстытут (спецыяльнасць "Машыны і тэхналогія ліцейнай вытворчасці").

Э. Пелагейчанка ў ролі графа Альмавіва ў оперы "Севільскі цырульнік" Дж. Расіні

1972

Пасля завяршэння навучання ў Новасібірскай дзяржаўнай кансерваторыі імя М.І. Глінкі адразу быў запрошаны вядучым салістам у Пермскі тэатр оперы і балета імя П.І. Чайкоўскага. За кароткі час спявак асвоіў вялізны рэпертуар, які ўключаў асноўныя партыі лірычнага і лірыка-драматычнага тэнара З 1975 па 1984-ы з'яўляўся штатным гастралёрам Вялікага тэатра Масквы.

Эдуард Пелагейчанка ў ролі Пінкертона (опера Дж. Пучыні "Мадам Батэрфляй")

1985

У 1985—2006-м быў вядучым салістам Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Рэспублікі Беларусь.

1987

З 1987-га Эдуард Іванавіч выкладаў у Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі; пасля адыходу са сцэны ў 2006-м прысвяціў сябе падрыхтоўцы маладых выканаўцаў. У БДАМ працаваў да чэрвеня 2018 года.

Опера "Яўген Анегін". Э. Пелагейчанка ў ролі Ленскага. 1990 г.

1999

За вялікі асабісты ўклад у развіццё беларускага опернага мастацтва, высокае выканальніцкае майстэрства Э.І. Пелагейчанка ўзнагароджаны медалём Францыска Скарыны. Праца ў галіне тэатральнага мастацтва адзначана прэміяй імя Л.П. Александроўскай.

Эдуард Пелагейчанка, спявак з яркім, палётным голасам шырокага дыяпазону, на сцэне Вялікага тэатра Беларусі выканаў мноства вядучых партый лірычнага і драматычнага рэпертуару. Сярод іх — граф Альмавіва ў оперы "Севільскі цырульнік" Дж. Расіні, Хазэ ў "Кармэн" Ж. Бізэ, Альфрэд, Дон Карлас, Рычард, Радамес у операх Дж. Вердзі "Травіята", "Дон Карлас", "Баль-маскарад", "Аіда", Пінкертон і Каварадосі ў операх Дж. Пучыні "Мадам Батэрфляй" і "Тоска", Турыду ў оперы "Сельскі гонар" П. Масканьі, Ленскі, Вадэмон, Герман у операх П. Чайкоўскага "Яўген Анегін", "Іаланта", "Пікавая дама", Князь у "Русалцы" А. Даргамыжскага, Юродзівы, Шуйскі ў оперы "Барыс Гадуноў" М. Мусаргскага, партыі ў операх беларускіх кампазітараў "Майстар і Маргарыта" Я. Глебава, "Візіт дамы" і "Юбілей" С. Картэса і іншыя.

2000

Удастоены Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь за свае найлепшыя ролі — Германа, Хазэ, Радамеса, Турыду, Альфрэда Іла.

Выступленні спевака з сольнымі канцэртамі заўсёды атрымлівалі шырокае прызнанне гледачоў і высокую ацэнку прафесіяналаў. Адным з найзначнейшых дасягненняў Эдуарда Іванавіча лічыцца выкананне ўсіх 103-х рамансаў Чайкоўскага і цыкла "Папулярная італьянская вакальная музыка".

Опера "Іаланта" П. І. Чайкоўскага. Вадэмон — Э. Пелагейчанка, 1985 г.

У Карціннай галерэі Гаўрыіла Вашчанкі працуе выстава "У свеце казак, міфаў, легенд".

Ёсць шанц — ёсць плён

Трэці сезон запар навагодні тэатралізаваны паказ Гарадскога палаца культуры “Орша” збірае сяброў Нацыянальнага алімпійскага камітэта Рэспублікі Беларусь. Гэтым разам на свяце “Алімпійская Ёлка” аршанцы прадставілі ў сталіцы праграму “Навагодняя алімпіяда Дзеда Мароза, або Космас наш!”.

НАВІДАВОКУ

Два яскравыя паказы наведалі з бацькамі каля 1500 хлопчыкаў і дзяўчынак ва ўзросце ад 3 да 13 гадоў. Гэта дзеці і ўнукі чэмпіёнаў і прызёраў Алімпійскіх гульняў, ветэранаў спорту, прадстаўнікоў спартыўных і іншых арганізацый. Сярод гасцей таксама выхаванцы сацыяльных устаноў краіны. Юных гледачоў чакалі маляўнічыя лакацыі, разнастайныя актыўнасці, атракцыёны, авіясімулятар і фотазона.

Самай захапляльнай часткай мерапрыемства стаў арыгінальны маштабны тэатралізаваны паказ. Папярэднічала яму святочная прамова Прэзідэнта Нацыянальнага алімпійскага камітэта Беларусі. Віктар Лукашэнка пажадаў дзецям моцнага здароўя, актыўна займацца спортам і спазнаваць новае.

У праграме прыняла ўдзел першая беларуская касманаўтка Марына Васілеўская. У паказе былі задзейнічаны каля сотні спецыялістаў і юных выхаванцаў цыркавога, танцавальных і вакальных калектываў Гарадскога палаца культуры “Орша”.

ЗАКУЛІССЕ

Над канцэпцыяй навагодняга свята шчыравалі дырэктар ГПК “Орша” Алена Дземух і рэжысёр Дарыя Гусакова. У сцэнарыі яны павінны былі ўлічыць шэраг патрабаванняў, якія выставіў НАК. Па словах Алены Дземух, распрацоўваць нешта крэатыўнае пад дакладна вызначанае спецыфічнае заданне заўсёды цяжэй, чым займацца свабоднай творчасцю.

— Заказчык паставіў задачу адлюстраваць алімпійскую тэматыку, — распавяла кіраўніца ўстановы культуры. — Мы — творчыя людзі, далёкія ад спорту, таму спачатку было цяжка. Але па выніку гэтая ёлка НАКа стала лепшай з трох, якія мы зрабілі.

Алена Дземух адзначае, што для палаца праект каштоўны тым, што дае магчымасць вывезці таленавітых дзяцей з правінцыі на вялікую пляцоўку. Не сакрэт, што выканаўцы і калектывы з глыбінкі не так часта выступаюць на мерапрыемствах рэспубліканскага ўзроўню, у вялікіх залах ці на арэнах. Па словах дырэктара, на гэта ёсць аб’ектыўныя прычыны. Рэжысёры, якія ўвесь час працуюць у Мінску, звычайна запрашаюць сталічных майстроў сцэны. Як прафесійных, так і самадзейных. Пастаноўшчыкі ведаюць іх узровень і задзейнічаюць тых, у кім упэўнены, каб атрымаць гарантаваны вынік, што натуральна. Але для калектываў і выканаўцаў з рэгіёнаў гэта пэўны бар’ер у развіцці.

— Алімпійская ёлка — шанц трапіць на вялікую сцэну, на тэлебачанне, — гаворыць Алена Дземух. — І для кожнага ўдзельніка нашага шоу навагоднія гастролі ў Мінску становяцца адной з самых запамінальных падзей у жыцці. Для маленькіх артыстаў з Оршы паехаць у сталіцу на два-тры дні і выступаць на вялікай сучаснай пляцоўцы азначае атрымаць творчы зарад і ўпэўненасць у тым, што іх мастацтва запатрабавана гледачом.

ПАД КЛЮЧ

Варта падкрэсліць, што Палац культуры “Орша” робіць гэты тэатралізаваны паказ “пад ключ”: не толькі стварае канцэпцыю і сцэнарый, музычнае і сцэнічнае афармленне, але і шые касцюмы. Усім гледачам запомніліся яркія і тэхналагічныя вобразы касмічных піратаў, вакал іх правадыра — зялёнай змяі — сімвала 2025 года, артыстызм Дзеда Мароза, Снягуркі і іх памочнікаў. Уразілі спецыяльна напісаныя для сёлетняга свята песні, яскравыя цыркавыя нумары і харэаграфія. Але галоўнае, што адрознівае гэтае шоу ад звычайнага дзіцячага ранішніка, — сцэнаграфія. Выкарыстанне сучасных тэхналогій дазволіла стварыць атмасферу сапраўднага касмічнага падарожжа, аб’яднаўшы ў адну прастору сцэну і глядзельную залу. Зрэшты, апошнюю такой можна назваць толькі ўмоўна, бо праграма змяшчала шмат інтэрактыўных элементаў.

ЗОРНЫ ЧАС

На навагоднім свяце НАКа можна было сустрэць зорак спорту — пераможцаў Алімпіяд розных гадоў з дзецьмі: Аляксандра і Андрэя Багдановічаў, Аляксея Абалмасава, прызёраў гульняў Магамеда Арыпгаджыева і Марыну Літвінчук, Аляксандра Раманькова з унучкай. Адзін з найлепшых беларускіх футбалістаў Аляксандр Глеб прыйшоў на Алімпійскую ёлку разам з сям’ёй.

Пабачыць захапляльнае відовішча змаглі не толькі спартыўныя знакамітасці і іх дзеці, але і мільёны беларусаў. Тэлеверсію шоу “Навагодняя алімпіяда Дзеда Мароза, або Космас наш!” Гарадскога палаца культуры “Орша” паказалі 31 снежня на тэлеканале “Беларусь-1”.

Віктар ГАЎРЫШ
Фота Ульяны КАСЦЮНІНАЙ

VII Адкрыты рэгіянальны конкурс “Вясёлыя смычкі” адбудзецца 16 лютага ў Ваўкавыску.

Свята беларускай Эўтэрпы

Ці ёсць свая апякунка ў нашай музыкі? Пэўна, з’явілася-адрадзілася. Прэм’ер, аўтарскіх вечарын беларускіх кампазітараў і проста выкананняў айчынных твораў розных часоў становіцца ўсё больш.

1. Падчас канцэрта "Харавыя Каляды ў стылі джаз".
2. Андрэй Саўрыцкі.

НА КРЫЛАХ ДА ОПЕРЫ

Дзяржаўны акадэмічны сімфанічны аркестр на чале з народным артыстам Беларусі Аляксандрам Анісімавым у адзін са сваіх філарманічных вечароў прапанаваў пачуць класік-рок-оперу **Сяргея Бельцюкова** “Крылы”. У імпрэзе ўдзельнічалі таксама Нацыянальная акадэмічная харавая капэла імя Р. Шырмы і запрошаныя салісты, уключаючы знакамітую Ірыну Крыкунову (партыя Голасу мары). Акрамя адпаведных сюжэту відэавыяў, намаляваных з дапамогай штучнага інтэлекту, на вялізным экране ў глыбі сцэны раз-пораз узнікалі паэтычныя радкі Роберта Раждэственскага, на якія і напісана опера. Атрымалася штосьці накшталт музычнага комікса з драматычным зместам. Чым не новы жанр на мяжы з кантатай і мюзіклам? У стылістыцы адчуваліся некаторыя тэндэнцыі мінулых дзесяцігоддзяў, бо клавір быў створаны нашмат раней. Але касмічны палёт Марыны Васілеўскай вымусіў кампазітара вярнуцца да матэрыялу і прысвяціць твор ёй.



Праўда, змест і оперы, і пакладзенай у аснову паэмы, куды дабавіліся асобныя вершы таго ж аўтара, падаўся больш шырокім, чым касмічная тэматыка. Крылы, што ў фінале вырастаюць на спіне героя, — гэта яшчэ і натхненне, нараджэнне ідэй. А ў тым, што прэзентацыя класік-рок-оперы насамрэч магла схіліць да творчага палёту, пераконвае выказванне Веранікі Кукуць, студэнткі Акадэміі музыкі:

— Я адчула ўвесь спектр эмоцый, часам не магла стрымаць слёз. У пэўныя моманты здавалася, быццам знаходзішся ўнутры самой дзеі. Злучэнне класікі і рока мела незвычайны эфект, музыка зачаравала. Нягледзячы на паўторнасць сцэн, нейкую рандальнасць формы, хацелася атрымліваць асалоду ад гучання зноў і зноў. Заварожвала аркестроўка, разлічаная на нязвыклы інструментальны склад. Адчувалася неймаверная аддача ўсіх музыкантаў, што натхнёна ішлі за дырыжорам, і тая зладжаная праца пакінула незабыўнае ўражанне. Гэта шэдэўр.

ДУХОЎНАСЦЬ І ФОЛК

У межах таго ж цыкла “Класіка без меж” аркестр Анісімава і саліст Сяргей Герман прэзентавалі скрыпічны канцэрт “Шукайце і знойдзеце” **Аліны Безенсон**. Назва пазычана з Новага Запавету. І гэта далёка не першы твор кампазітара на біблейскую тэматыку. Духоўны змест маюць усе інструментальныя канцэрты майстра: два фартэпіянныя, а таксама для баяна, домры, кларнета, цымбалаў, трубы. Гэтыя работы выконваліся не толькі ў Беларусі, але і ў Расіі, перамагалі ў конкурсах.

А колькі аўтарскіх вечарын зладжана за апошнія тыдні! **Вольга Вараб’ёва** разам з вакальным ансамблем “Камерата”, які яна ўзначальвае, капэлай Р. Шырмы і ансамблем салістаў “Класік-Авангард” падрыхтавала выбітны творчы праект “Сюіта сямі вятроў”: 12 частак адлюстроўваюць поры года праз народнае светаўспрыманне, зафіксаванае ў беларускім песенным фальклоры. Як і ўсе кампазіцыі Вольгі, сюіта, насамрэч блізкая да кантаты, уяўляе сабой дзівосную сумесь атмасферных музыкі, заснаванай на тонкіх тэмбравых зменах і гукавых эфектах, з няўлоўна-відавочнай фальклорнай асновай і размаітасцю джазавых паневаў. Пазнавальнасць індывідуальнага стылю — несумненная.

Андрэй Саўрыцкі, што кіруе Акадэмічным хорам Белтэлерадыёкампаніі і славіцца выкшталцонымі апрацоўкамі класікі і фальклору, у філарманічным канцэрце гэтага калектыву “Харавыя Каляды ў стылі джаз” прэзентаваў месу ў шасці частках. Кананічны жанр узбагачуўся разнастайнымі джазавымі прыёмамі, сучасным падыходам да разгалінаванай фактуры.

ШТОДЗЁННАСЦЬ І ПАЗІТЫЎ

У Мінскай абласной бібліятэцы імя А. Пушкіна адбыўся аўтарскі канцэрт **Алены Храбровай**, дзе гучала яе камерная музыка. Здавалася б, усё зроблена вельмі проста, традыцыйна. Але колькі пазітыву, што сагравае душу! П’есы для фартэпіяна, флейты нагадвалі кінамузыку (кампазітар ужо пісала для “сінема”), а некаторыя рамансы — фрагменты з мюзікла. Мабыць, штосьці складзецца з гэтым жанрам?

Аўтарскую вечарыну “У садзе маіх летуценняў...” ладзіў у філармоніі зусім малады **Ігар Комар**. У 27 гадоў ён лаўрэат звыш 25 прэстыжных кампазітарскіх конкурсаў, яго музыка гучыць не толькі ў Беларусі, але і на буйных міжнародных фестывалях у Маскве, Сочы, Бялградзе. Зала імя Р. Шырмы была паўнюткая. Прыехала нават цэлая дэлегацыя з Баранавіцкага музычнага каледжа, які Ігар заканчваў, перш чым паступіў у Акадэмію музыкі. Там творца вучыцца ў аспірантуры, адначасова выкладае і з’яўляецца дэканам факультэта павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі. Больш традыцыйныя вакальныя опусы спалучаліся з інструментальнымі, заснаванымі на санорных пошуках, уласцівых почырку кампазітара (згадаце яго саўндтрэк да стужкі “Кіношнікі”).

Беларускай музыкі ўсё больш у штодзённым дзіцячым рэпертуары. У доказ — X фестываль-конкурс **“Дзяржынскі куфэрак”** у мясцовай школе мастацтваў.

— Дзеці ад 7 да 12 гадоў прыехалі з розных куткоў краіны, — распавяла Галіна Гарэлава, старшыня журы, кампазітар. — І ўсе выконвалі па два айчынныя фартэпіянныя творы. Атрымалася не толькі святочная падзея вялікай культурна-эстэтычнай важнасці, але і акт выхаваўча-патрыятычнага значэння. Так дзеці вучацца ўспрымаць традыцыі высокай духоўнасці нашай нацыі.

Надзея БУНЦЭВІЧ

3. Ігар Комар.
4. Аляксандр Анісімаў і Сяргей Бельцюкоў падчас класік-рок-оперы "Крылы".
5. На X фестывалі-конкурсе "Дзяржынскі куфэрак".

Больш культурных навін — у нашым Telegram-канале @kultinfa.

Колькі ні кажы “нельга”, злоўжыванне службовым становішчам не знікае. Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь абагульніла інфармацыю, звязаную з парушэннямі заканадаўства аб барацьбе з карупцыяй.

Прадухіліць карупцыю

Аналіз праводзіўся ў рамках плана работы камісіі па супрацьдзеянні карупцыі Міністэрства культуры на 2024-ы, зацверджанага пратаколам пасяджэння камісіі па супрацьдзеянні карупцыі ад 29 снежня 2023 года № 9. У выніку былі вызначаны напрамкі, што прывялі да парушэння антыкарупцыйнага заканадаўства.

Афармленне абавязацельстваў па выкананні абмежаванняў, устаноўленых антыкарупцыйным заканадаўствам

Выяўлены парушэнні артыкула 17 Закона Рэспублікі Беларусь “Аб барацьбе з карупцыяй” ад 15 ліпеня 2015 года № 305-З — адсутнасць адрозненняў у змесце абавязацельстваў па выкананні абмежаванняў, устаноўленых антыкарупцыйным заканадаўствам незалежна для дзяржаўных службовых асоб і асоб, якія да іх прыраўнаваны.

Даведка: названы артыкул змяшчае забарону на выкананне іншай аплатнай працы дзяржаўнымі службовымі асобамі. Важна разумець, што абмежаванне датычыцца не ўсіх такіх асоб, а толькі кіраўнікоў, іх намеснікаў і галоўных бухгалтараў у дзяржаўных арганізацыях.

Урэгуляванне канфлікту інтарэсаў

Устаноўлены факты недастатковага кантролю за прадухіленнем і ўрэгуляваннем канфлікту інтарэсаў і, адпаведна, за выкананнем часткі першай артыкула 21 Закона РБ “Аб барацьбе з карупцыяй”. Згодна з ёй, дзяржаўная службовая асоба мусіць пісьмова паведаміць непасрэднаму кіраўніку аб узнікненні канфлікту інтарэсаў або магчымасці яго ўзнікнення, як толькі з’явяцца адпаведныя звесткі, і мае права пісьмова заявіць самаадвод ад прыняцця рашэння, ад удзелу ў прыняцці рашэння або ад іншых дзеянняў па службе (працы), якія выклікаюць ці могуць выклікаць канфлікт інтарэсаў.

Даведка: найчасцей канфлікт інтарэсаў звязаны з прыёмам на працу або прасоўваннем па працы, улікам працоўнага часу, размеркаваннем прэмій для работнікаў, выбарам пастаўшчыка тавараў або выканаўцы паслуг.

Перавышэнне службовых паўнамоцтваў з карыслівай зацікаўленасці

Выяўлена злачынства, якое адносіцца да часткі 2 артыкула 426 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь (перавышэнне ўлады або службовых паўнамоцтваў, учыненае з карыслівай або іншай асабістай зацікаўленасці).

Даведка: устаноўлены выпадак, калі работнікі, якія атрымалі прэмію, павінны былі аддаць яе пэўную частку кіраўніку. Гэта перавышэнне ўлады або службовых паўнамоцтваў, учыненае з карыслівай або іншай асабістай зацікаўленасці. У адпаведнасці з часткай 2 артыкула 426 КК РБ яно з’яўляецца крымінальным злачынствам (кіраўнік караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад двух да шасці гадоў са штрафам або без штрафу і з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады або займацца пэўнай дзейнасцю).

Ажыццяўленне закупак

Зафіксаваны правапарушэнні, якія ствараюць умовы для карупцыі, пры арганізацыі і правядзенні дзяржаўных закупак. Акрэсленыя выпадкі звязаны з тым, што быў няправільна вызначаны від адпаведных працэдур.

Даведка: пункт 1 артыкула 18 Закона Рэспублікі Беларусь ад 13 ліпеня 2012 года № 419-З “Аб дзяржаўных закупках тавараў (работ, паслуг)” змяшчае вычарпальны пералік відаў працэдур дзяржаўнай закупкі.

Больш за ўсё карупцыйных рызык датычыцца закупкі тавараў (работ, паслуг) за кошт як уласных сродкаў арганізацый, так і бюджэтных. На гэтую сферу прыпадае звыш дзвюх трацін усіх карупцыйных праяў.

Да карупцыйных рызык адносіцца і неналежны ўлік працоўнага часу. Размова пра адсутнасць кантролю за тым, як асобныя работнікі выконваюць графік працы, і адлюстраванне ў табелях недакладнай колькасці фактычна адпрацаваных гадзін, што прыводзіць да незаконнага ўзбагачэння.

Папярэджанне непажаданых праяў

У Міністэрстве культуры лічаць: адзін з напрамкаў прафілактыкі азначаных правапарушэнняў — ацэнка карупцыйных рызык як найважнейшы элемент антыкарупцыйнай палітыкі. Яна дазваляе забяспечыць адпаведнасць антыкарупцыйных мерапрыемстваў спецыфіцы дзейнасці арганізацыі і рацыянальна выкарыстоўваць рэсурсы для папярэджання непажаданых праяў.

Ідэнтыфікаваць рызыкі можна, выяўляючы зоны з агульным павышаным карупцыйным фактарам.

Прадухіленне карупцыі павінна быць накіравана ў першую чаргу на выключэнне карупцыйных праяў, у тым ліку праз распрацоўку і прыняцце адпаведных лакальных прававых актаў, канкрэтызацыю паўнамоцтваў службовых асоб, сістэмнае навучанне і павышэнне кваліфікацыі работнікаў.

Афіша з 10 па 17 снежня

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

г. Мінск, пр-т Пераможцаў, 8, тэл.: 8 017 2030792, 8 029 1440792

- **Пастаянная экспазіцыя.**
- Выстава ёлачных рэтрацацак **“Цацкі, якія захоўваюць памяць”**. **Да 12 студзеня.**
- Часовая экспазіцыя **“Музей, якому служыш”**, прысвечаная 80-годдзю ўстановы.
- Часовая экспазіцыя **“Адзінай памяці верныя”**, прысвечаная 80-годдзю вызвалення Беларусі.

Падрабязнасці ў сацыяльных сетках і на сайце **warmuseum.by**.

УНП 100235472

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ЦЭНТР СУЧАСНЫХ МАСТАЦТВАЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, вул. Някрасава, 3, тэл.: 8 017 2350331, час працы: серада — нядзеля з 12.00 да 20.00

- Выставачны праект **“Трыяда. Скульптура — архітэктура — горад”. Да 2 лютага.**
- Выстава Сяргея Дажджа **“АБСТРАШКА і абстрактная АЗБУКА”. Да 2 лютага.**
- Выстава твораў з фонду НЦСМ **“Цёплыя стасункі”. Да 16 лютага.**
- Персанальная выстава Аляксандра Трускоўскага **“[Не]асабістае пытанне”. Да 16 лютага.**

г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 47, тэл.: 8 017 2350332, 8 017 3990978, час працы: аўторак — нядзеля з 12.00 да 20.00

- Выстава **“Рэха мадэрнізму. Ад Манэ да Кандзінскага”. Да 19 студзеня.**

УНП 192545414

БЕЛАРУСКІ ТЭАТР “ЛЯЛЬКА”

г. Віцебск, вул. Пушкіна, 2, тэл.: 8 0212 669077 (каса)

- Святочная праграма **“З Новым годам, добры Гном!”**, танцавальна-забаўляльная праграма **“Гнамуляндыя танцуе зноў” (3+)**. Глядзельная зала і фае тэатра. **11 студзеня ў 11.00, 12 студзеня ў 11.00.**
- Навагодняя танцавальна-забаўляльная праграма **“Казкі чароўнага лесу” (2+)** ад тэатра лялек “Ухтышка”, Віцебск. Фае тэатра. **11 студзеня ў 17.00, 12 студзеня ў 17.00.**
- Інтэрактыўная казка **“Вясёлы Дарафей” (3+)**. Глядзельная зала. 18 студзеня ў 11.00.

УНП 300001869

МУЗЕЙ В. К. БЯЛЫНІЦКАГА-БІРУЛІ

г. Магілёў, вул. Ленінская, 37, тэл.: 8 0222 650203, 8 0222 658800

- **Пастаянныя экспазіцыі.**
- Art-lectorium **“Зразумелае мастацтва”. Праводзіцца заўсёды.**

Падрабязней на сайце **artmuseum.by** альбо па тэлефонах 8 0222 650203, 8 0222 658800.

УНП 100377771

Спрадвеку беларускае

З розных куткоў свету ў Гарадоцкі Дом рамёстваў і фальклору Цэнтра традыцыйнай культуры і народнай творчасці Гарадоцкага раёна прыязджаюць госці — палюбавацца ўнікальнай кісяёй і вышыўкай, багатай калекцыяй вырабаў з саломы, гліны, дрэва, іншых матэрыялаў.

Марына Гушча

МАКУЛІНКА ЗА МАКУЛІНКАЙ

Дыпломная работа Марыны Гушчы, выпускніцы мастацка-графічнага факультэта Віцебскага дзяржуніверсітэта імя П.М. Машэрава, будучай кіраўніцы аднаго з самых паспяховых у нашай краіне Дамоў рамёстваў, была прысвечана ткацтву. Строгай камісіі дзяўчына прадстаўляла свой першы ў жыцці габелен — ацанілі высока. З гэтай працы і пачаўся яе прафесійны шлях у традыцыйнае беларускае мастацтва даўжынёй у 35 гадоў.

— У 1989-м мне прапанавалі ўзначаліць народны клуб майстроў і самадзейных мастакоў “Вытокі” пры Гарадоцкім раённым краязнаўчым музеі. А праз тры гады быў утвораны Дом рамёстваў і фальклору, — успамінае Марына Леанідаўна.

З таго моманту асаблівую ўвагу супрацоўнікі надавалі этнаграфічным паездкам: даследчая работа давала магчымасць вывучаць рамёствы Гарадоччыны.

— Пасля Вялікай Айчыннай вайны ў вёсках практычна нічога не засталося з аўтэнтычных прадметаў, таму бясцэннымі былі гутаркі з майстрамі — па іх аповедах, макулінка за макулінкай, мы адноўлялі старадаўнія тэхнікі, — распавядае суразмоўца. — І ў выніку дасягнулі жаданага: ствараем вырабы, якія дакладна паўтараюць арыгіналы: ідэнтычныя арнаменты, крой асобных элементаў строяў, каляровая гама.

Што датычыцца самой таленавітай майстрыхі, то яна поўнасцю пагрузілася ў ткацтва, асвойвала адну тэхніку за другой. Праз дзевяць гадоў прыйшла да ажурнага, якое і аказалася самым блізкім да сэрца. Паспяхова ўдзельнічала ў конкурсах.

Узор на ручніку сімвалізуе ўраджай

Найбольш запамінальным для Марыны Гушчы стаў “Славянскі базар у Віцебску” у 2001-м, які прынёс ёй гран-пры — першую буйную ўзнагароду.

АЎТЭНТЫЧНЫЯ ТЭХНАЛОГІІ

Гарадоцкія ажурныя ручнікі, абрусы і сурвэткі не пераблытаць з іншымі: ткуцца яны з адбеленых ільняных нітак і нагадваюць разрэджаную сетачку; краі ўпрыгожаны карункамі. У 2013-м намаганнямі Марыны Леанідаўны гарадоцкая кісяя была ўнесена ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь.

А ў 2014-м Марына Гушча ўзначаліла Дом рамёстваў і фальклору. Пад яе кіраўніцтвам калектыў прадоўжыў працу над аднаўленнем аўтэнтычных тэхналогій. Сёння да нематэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей Беларусі аднесены яшчэ чатыры элементы: спіральнае пляценне, берасцянікі (гаршкі, апленены бяростай), наіўнае мастацтва і саламяныя павукі. Але на гэтым майстры не спыняюцца: ужо падалі дакументы на прысваенне высокага статусу элементу “вышыўка ў тэхніцы перавіць”.

ЗОРНЫ КАЛЕКТЫЎ

Цяпер у Гарадоцкім Доме рамёстваў і фальклору працуе 20 чалавек, пяцёра з іх — народныя майстры Рэспублікі Беларусь, дзясяцера — члены Беларускага саюза майстроў народнай творчасці. Уражае і колькасць напрамкаў — 14: народны касцюм і беларуская лялька, саломапляценне і спіральнае пляценне, наіўнае мастацтва і вышыўка, ганчарная справа і кераміка, лозапляценне, ткацтва і іншыя.

— Да абласных “Дажынак-2014” для нас узвялі спецыяльны добраўпарадкаваны будынак: ёсць усё, што неабходна для плённай працы майстроў, — якасныя матэрыялы, прылады і прыстасаванні, абсталяванне. Умовы вельмі добрыя! І ўсё ж галоўны складнік паспяховай дзейнасці ўстановы — калектыў і адданасць кожнага справе, — перакананая кіраўніца. — А ў нас людзі надзейныя і адказныя. Старэйшыя з задавальненнем перадаюць досвед маладым, а тыя заряджаюць энергіяй.

Прапаганда беларускай нацыянальнай культуры вядзецца праз арганізацыю лекцый і семінараў, майстар-класаў і экскурсій. Асноўны напрамак — навучанне традыцыйным рамёствам дзяцей і дарослых, у тым ліку людзей з інваліднасцю. Усе выкладчыкі маюць вышэйшую педагагічную адукацыю.

АДЗНАКА “ВЫДАТНА”

Тытанічная праца майстроў па захаванні і развіцці нацыянальнай спадчыны шмат разоў атрымлівала адпаведную адзнаку. Так, у 2007-м Гарадоцкі Дом рамёстваў і фальклору ўдастоены спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь “За духоўнае адраджэнне” ў намінацыі “Народная творчасць”; у 2002, 2013 і 2019 гадах прызнаваўся найлепшым на Віцебшчыне. Сярод значных узнагарод таксама гран-пры абласнога конкурсу народнага касцюма “Сцяжкі майстэрства” ў 2016-м за рэканструкцыю народнага строю ў тэхніцы набойкі, два гран-пры ў 2023-м — за спіральнае пляценне і вышыўку.

Высока ацэнены і значны асабісты ўклад кіраўніцы Гарадоцкага Дома рамёстваў і фальклору, народнага майстра Беларусі Марыны Леанідаўны Гушчы ў адраджэнне і папулярызацыю народных рамёстваў, захаванне і прымнажэнне гісторыка-культурнай спадчыны. Марына Леанідаўна мае ганаровае званне “Чалавек года Віцебшчыны — 2011”, з’яўляецца пераможцай рэспубліканскага конкурсу “Чалавек Года культуры”. А ў 2020-м атрымала Грант Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь на рэалізацыю праекта па развіцці тэхналогіі ажурнага ткацтва Гарадоцкага раёна. За сродкі было закуплена новае абсталяванне, наняты спецыялісты, якія рабілі інструменты і прыстасаванні, ткалі і праводзілі навучанне ткачых з розных рэгіёнаў краіны. У тым жа годзе Марыну Гушчу ўдастоілі нагруднага знака Міністэрства культуры “За ўклад у развіццё культуры Беларусі”. У актыве загадчыцы Гарадоцкага Дома рамёстваў і фальклору таксама і шматлікія іншыя ўзнагароды.

Святлана ЧЭКАЛАВА

Афіша з 10 па 17 снежня

НАЦЫЯНАЛЬНЫ МАСТАЦКІ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, вул. Леніна, 20, тэл.: 8 017 3970163 (экскурсійнае бюро)

- **Пастаянныя экспазіцыі.**
- Выставачны праект **“Кудрэвічы. Адданыя мастацтву”**, прымеркаваны да 140-годдзя з дня нараджэння заслужанага дзеяча мастацтваў БССР Уладзіміра Мікалаевіча Кудрэвіча (1884—1957). **Да 13 студзеня.**
- Выстава **“Страты і вяртанні. Лёс мастацкіх каштоўнасцей Дзяржаўнай карціннай галерэі. 1939—1957”**, прымеркаваная да 80-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і 85-годдзя Нацыянальнага мастацкага музея. **Да 20 студзеня.**
- Выстава **“Лейба Альпяровіч. Да 150-годдзя”. Да 23 лютага.**
- Выстава **“Расія — Беларусь. Скрыжаванне лёсаў”. Да 31 сакавіка.**
- Экскурсіі: **“Самыя-самыя...” (6+), “Якога колеру зіма?” (6+), “Казкі Усходу” (10+), “Міфы Старажытнай Грэцыі і Рыма” (10+), “Партрэты даўнія мінулых пакаленняў...” (10+), “Пяць моў кахання” (16+), “Жаночы партрэт” (16+), “Мінск у музеі” (16+). Праводзяцца заўсёды.**

УНП 100377771

МУЗЕЙ “ДОМ ВАНЬКОВІЧАЎ. КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА 1-Й ПАЛОВЫ XIX СТ.”

г. Мінск, вул. Інтэрнацыянальная, 33а, тэл.: 8 017 3637796, 8 017 3588878

- **Пастаянная экспазіцыя.**
- Тэматычная праграма **“Раство ў Ваньковічаў”** з майстар-класам па вырабе навагодніх цацак і 3D-паштовак. **Да 15 студзеня.**
- Выстава жывапісу бытавога жанру **“Імгненні жыцця”** XIX — пачатку XX стагоддзя з фондаў Нацыянальнага мастацкага музея. **Да 18 студзеня.**
- Праграма **“Кафляныя «люстэркі» шляхецкай сядзібы”. Праводзіцца заўсёды.**
- Квэст **“Таямніцы старажытнай сядзібы”**. Папярэдні запіс. **Праводзіцца заўсёды.**
- Квэст **“Пошукі мінулага”. Праводзіцца заўсёды.**
- Экскурсія **“Інтэр’ер шляхецкай сядзібы”**. Папярэдні запіс. **Праводзіцца заўсёды.**
- Экскурсія **“Шлях мастака Валенціна Ваньковіча”**. Папярэдні запіс. **Праводзіцца заўсёды.**
- Экскурсія **“Сядзібны партрэт”**. Папярэдні запіс. **Праводзіцца заўсёды.**

УНП 100377771

МУЗЕЙ БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА МАСТАЦТВА

Мінскі р-н, Астрашыцка-Гарадоцкі с/с, в. Аколіца, вул. Іванаўская, 176, тэл.: 8 017 5074468

- **Пастаянная экспазіцыя.**
- Выстава **“Хронікі Музея беларускага народнага мастацтва. 45 гадоў”**, прымеркаваная да 45-годдзя з дня адкрыцця філіяла для наведвальнікаў. **Да 2 сакавіка.**
- **Батлеечны спектакль. Праводзіцца заўсёды.**
- Майстар-клас **“Саломапляценне”. Праводзіцца заўсёды.**
- Майстар-клас **“Лялька-мотанка”. Праводзіцца заўсёды.**
- Майстар-клас **“Ткацтва”. Праводзіцца заўсёды.**

УНП 100377771

МАГІЛЁЎСКІ АБЛАСНЫ ДРАМАТЫЧНЫ ТЭАТР

г. Магілёў, вул. Першамайская, 7,
тэл.: 8 0222 656604 (каса),
сайт: **mdrama.by**

• Музычная казка ў 1 дзеі **"Як Кашчэй Бессмяротны з Васілісай ажаніўся" (6+). 11 студзеня ў 12.00.**
• Крымінальная камедыя **"Хітрыкі Скапена" (16+)**. Прэм'ера. **11 студзеня ў 18.30.**
• Казачны атракцыён у 2 дзеях **"Па шчупаковай волі" (6+). 12 студзеня ў 12.00.**
• Прыпавесць пра каханне **"Соня" (16+)**. Прэм'ера. **12 студзеня ў 18.30.**
• Чароўная казка **"Іван-царэвіч і Шэры Воўк" (18+)**. Начны паказ і фотасэт у дэкарацыях. Прэм'ера. **12 студзеня ў 19.30.**
• Пастаноўка "замест ліста" ў 1 дзеі **"Лілічка" (16+). 14 студзеня ў 18.30.**
• Містычны трылер, камедыя абсурду **"Гульцы" (12+)**. Прэм'ера. **15 студзеня ў 18.30.**
• Трагедыя па матывах камедыі **"Дон Жуан" (16+)**. Прэм'ера. **16 студзеня ў 18.30.**
• Камедыя ў 1 дзеі **"Настаўленне для ахвотных ажаніцца" (16+). 17 студзеня ў 18.30.**

УНП 700184039

НАЦЫЯНАЛЬНЫ АКАДЭМІЧНЫ ТЭАТР ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ

г. Мінск, вул. Энгельса, 7,
тэл.: 8 017 3654237, 8 017 3576627,
пошта: kupalabilet@mail.ru

• Імпрэза **"Музыка душы. Роднае" (0+)**. Камінная зала. **10 студзеня ў 19.00.**
• Трагікамедыя **"Апошні атракцыён" (16+)**. Галоўная сцэна. **11 студзеня ў 19.00.**
• Праграма **"Зімачка" (6+)** ансамбля "Харошкі". Галоўная сцэна. **17 студзеня ў 19.00.**
• Канцэрт у цемры **"Ёсць у мяне толькі ты" (18+)**. Жывы гук. Імпрэза праводзіцца па вул. Валгаградскай, 35. **17 студзеня ў 19.00.**
• Трагікамедыя **"Дзядзечкаў сон" (16+)**. Прэм'ера. Галоўная сцэна. **18 студзеня ў 19.00.**

УНП 100377901

НАЦЫЯНАЛЬНЫ АКАДЭМІЧНЫ ВЯЛІКІ ТЭАТР ОПЕРЫ І БАЛЕТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, пл. Парыжскай Камуны, 1,
тэл.: 8 017 2431041 (каса),
8 017 3615493

• Балет у 2 дзеях **"Папялушка" (6+). 10 студзеня ў 19.00, 12 студзеня ў 18.00.**
• Экскурсія **"Унікальны свет закулісся Вялікага тэатра Беларусі" (6+). 11 студзеня ў 14.00, 15 студзеня ў 15.30, 16 студзеня ў 15.30.**
• Опера-балет у 2 дзеях **"Вілісы. Фатум" (12+). 11 студзеня ў 18.00.**
• **Вялікі навагодні баль. 13 студзеня ў 19.00.**
• Балет у 2 дзеях **"Лебядзінае возера" (12+). 15 студзеня ў 19.00.**
• Опера ў 3 дзеях **"Макбет" (16+). 16 студзеня ў 19.00.**
• Балет у 2 дзеях **"Шчаўкунок" (6+). 17 студзеня ў 19.00.**
• Опера-буфа ў 2 дзеях **"Любоўны напой" (12+). 18 студзеня ў 18.00.**

УНП 191081322

Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь

аказвае фізічным і юрыдычным асобам паслугі па рэстаўрацыі і кансервацыі ікон, твораў выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

Тэлефоны: **8 017 3970163, 8 025 6677819**.

УНП 100377771

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНЫ МУЗЕЙ-ЗАПАВЕДНІК "НЯСВІЖ"

г. Нясвіж, вул. Ленінская, 19,
тэл.: 8 01770 20602, 8 01770 20660,
8 029 5518051, 8 029 1903149

Палацавы ансамбль
• Тэатралізаваная экскурсія **"Тэатральны экспромт". 11 студзеня з 12.00.**
• Экспазіцыя **"Звяжам свет прыгажосцю"**. Калекцыйная зала "Нумізматыка і фалерыстыка". **Да 26 студзеня.**
• Экспазіцыя ёлачных цацак і ўпрыгожанняў **"Калі запальваюцца ёлкі"** з прыватнай калекцыі Наталлі Кавалёвай (Віцебск). Малая выставачная зала. **Да 9 лютага.**
• Экспазіцыйны праект **"Не пакідай мяне, мой светлы сум"** скульптараў Льва і Сяргея Гумілеўскіх. Вялікая выставачная зала. **Да 13 красавіка.**
• Міжнародны выставачны праект **"Castrum doloris. Пахавальны цырыманіял нясвіжскага двара". У складзе пастаяннай экспазіцыі.**
• Квэст **"Палацавыя таямніцы"**.
• Віртуальныя выставы: **"Ператвораныя ў попел. Генацыд беларускага народа на тэрыторыі Нясвіжскага раёна ў гады вайны"**, **"Нясвіж — здабытак сусветнай культуры"**, **"Разбуральны след вайны ў архітэктуры Нясвіжа"**, **"Шэдэўры калекцыі і ўнікальныя артэфакты музея-запаведніка «Нясвіж»"**.
• Тэматычныя і аглядныя экскурсіі па гісторыка-архітэктурных помніках і ландшафтных парках Нясвіжа.

Інфармацыйна-касавы цэнтр (г. Нясвіж, вул. Гейсіка, 1)
• Экспазіцыя твораў графікаў **"Мастак — кніга — тэкст". Да 15 студзеня.**

Ратуша
• Экспазіцыя **"Рэгенерацыя гістарычнай часткі г. Нясвіж. Эфектыўнае гарадское асяроддзе". Да 20 лютага.**

Пастаянныя экспазіцыі
• **"Гарадское самакіраванне ў Нясвіжы ў XVIII — 1-й палове XIX ст.".**
• Калекцыя гадзіннікаў XIX—XX стагоддзяў **"Культура часу"**. З фондаў музея-запаведніка.

Мерапрыемствы
• Квэсты: **"Безаблічны артэфакт"**, **"Карта сямі каралеўстваў"**, **"Музейны дэтэктыў"**, **"Музейнае расследаванне"**.
• Культурныя мерапрыемствы: **"Прыём у княгіні"**, **"Дзень нараджэння ў ратушы"** (група да 12 чалавек ад 6 да 11 гадоў).
• Сюжэтна-ролевая развівальная праграма **"Школа шпіёнаў"** (да 25 чалавек).
• Гульня-знаёмства **"Музейка аб музеі"** (група да 25 чалавек ад 4 да 7 гадоў).
• Гульнявая праграма **"Выкрунтасы"** (група да 25 чалавек).

Падрабязнасці па тэлефонах 8 01770 20602, 8 01770 20660 або на сайце **niasvizh.by**.

УНП 600207920

ЗАМКАВЫ КОМПЛЕКС "МІР"

г. п. Мір, Карэліцкі р-н,
Гродзенская вобл.,
тэл.: 8 01596 36290,
8 01596 36270

• **Пастаянная экспазіцыя.**
• **Калядны баль для дарослых. 11 студзеня ў 19.00.**
• Экспазіцыя **"Жыццё без меж"**, прысвечаная творчасці людзей з асаблівымі патрэбамі. **Да 19 студзеня.**
• Экспазіцыя **"Арсенал: ваенная зброя ў гістарычным кантэксце"**. Сумесны праект з Гродзенскім дзяржаўным гісторыка-археалагічным музеем. Паўночны корпус. **Да 22 кастрычніка.**
• **Лекцыя-візуалізацыя. Кожную сераду і суботу.**
• Экспазіцыя **"Войны XX стагоддзя. Гета ў Мірскім замку"**.
• Аглядныя і тэматычныя экскурсіі.
• Экскурсіі з элементамі тэатралізацыі для дзяцей і дарослых.
• Экскурсія для дваіх **"Інтрыгі Купідона"**.
• Сямейная квэст-экскурсія **"Легенды і паданні Мірскага замка"**.
• Музейныя заняткі для дзяцей сярэдняга школьнага ўзросту: **"Святочная страва для князя па старадаўнім рэцэпце"**, **"Асаблівасці жаночага касцюма XVIII ст."**, **"Арганізацыя войска і вайсковая справа ВКЛ у XVI ст."**, **"Печы з каробкавай кафлі XVI—XVII стст. у палацы князёў Радзівілаў"**.

УНП 590201541

СТРАТА

Міністэрства культуры выказвае шчырыя спачуванні родным, блізкім і калегам **Артура Гарыевіча Зельскага** ў сувязі з яго смерцю.

Артур Зельскі працаваў дырэктарам Дзяржаўнай установы "Дзяржаўны мемарыяльны комплекс «Хатынь»" з 2010 па 2024 год. У 2023-м да 80-й гадавіны трагедыі па даручэнні Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у мемарыяльным комплексе адкрыўся незвычайны музей — эмацыйная прастора, патрапіўшы ў якую кожны наведвальнік прапускае праз сябе ўсю жудасць вайны, пранікаецца жахлівым пачуццём трагізму і гора, якія яна нясе. Канцэпцыю музейнай экспазіцыі прапанаваў менавіта Артур Зельскі. Стваральнікі музея адышлі ад інфармацыйнай насычанасці, зрабіўшы стаўку на інтэрактыўнасць і непасрэдную ўцягнутасць наведвальніка. Артур Гарыевіч адзначаў, што не хацелі дубляваць Музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны або іншыя музеі. Менавіта пад кіраўніцтвам Артура Зельскага былі праведзены значныя работы па рамонце і добраўпарадкаванні мемарыяльных комплексаў "Хатынь", "Курган Славы" і "Дальва".

Артур Гарыевіч адбыўся і як навуковец у галіне гісторыі Беларусі. Аўтар больш чым 150 навуковых і навукова-папулярных работ і 7 манаграфій. Дзякуючы яго адказнай працы мемарыяльны комплекс "Хатынь" і філіялы з'яўляюцца месцам грамадзянскага і патрыятычнага выхавання, аб'ектам для правядзення шматлікіх міжнародных і нацыянальных мерапрыемстваў.

СТРАТА

Рэспубліканскі цэнтр нацыянальных культур глыбока смуткуе па **Раісе Іосіфаўне Вайцяхоўскай** — руплівіцы на ніве беларускай культуры, якая заўчасна пайшла з жыцця, — і выказвае шчырыя спачуванні сям'і, родным і блізкім у сувязі з непапраўнай стратай.

2006 2010 2022

КУЛЬТУРА

Сайт: kultura-info.by
E-mail: kim@kultura-info.by

ШТОТЫДНЁВАЯ ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ ГАЗЕТА, ДЛЯ ДАСУГУ (КУЛЬТУРА, МАСТАЦТВА). Выдаецца на беларускай мове.

Заснавальнік — Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь. Рэгістрацыйнае пасведчанне № 637, выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА".

Дырэктар — КУЗНЯЦОВА Наталля Васільеўна.

Рэдакцыя газеты "Культура": Галоўны рэдактар — КУЗНЯЦОВА Наталля Васільеўна.

Намеснік галоўнага рэдактара — ШЧУРОК Жанна Генадзьеўна.

Адказны сакратар — Галіна МАЛІНОЎСКАЯ.

Рэдактар аддзела — Віктар ГАЎРЫШ.

Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 77, чацвёрты паверх.

Тэлефон: 8 017 2860797.
Тэлефон-факс: 8 017 3345741.
Бухгалтэрыя: 8 017 3345735.
Рэкламны аддзел: 8 017 2860797.

Падпісныя індэксы: 63875, 638752, 63879.

Ільготныя на паўгоддзе: 63872, 638722 (зніжка 15 %).

Камплект (газета "Культура" і часопіс "Мастацтва"): 63874, 638742 (зніжка 10 %).

Аўтары допісаў паведамляюць прозвішча, поўнасцю імя і імя па бацьку, пашпартныя звесткі (нумар, дату выдачы, кім і калі выдадзены пашпарт, асабісты нумар), асноўнае месца працы, зваротны адрас. Аўтарскія рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца. Меркаванне аўтара можа не адпавядаць пункту гледжання рэдакцыі. Аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць матэрыялаў.

Набыць газету ў Мінску можна ў крамах "Белдрук" на пр-це Незалежнасці, 48, і Пераможцаў, 5, на вул. Лабанка, 2, Валадарскага, 16, Няміга, 30, Леніна, 18, Максіма Багдановіча (ля прыпынку "Ст. м. «Няміга»"), у падземных пераходах на плошчы Перамогі і станцыі метро "Пятроўшчына".

Падпісана ў друк 09.01.2025 у 16.00. Замова № 52. Наклад 4185.

Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства "Выдавецтва «Беларускі Дом друку»". 220013, г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 79/1. ЛП № 38200000007667 ад 30.04.2004.

© "Культура", 2025.

Рознічны кошт — па дамоўленасці.

* — матэрыял на правах рэкламы.